МІНПРЫРОДЫ: «ЗАЛАТАЯ» ТЭМА ЗАКРЫТАЯ 3

ЯК ЗМАГАЦЦА З «МАЎКЛІВЫМ ЗАБОЙЦАМ» 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 ЛІПЕНЯ 2019 г. СЕРАДА № 142 (29009)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей АЎРАМЕНКА, міністр транспарту і камунікацый:

«У чэрвені 2018 года была зацверджана канцэпцыя развіцця абласных аэрапортаў, у якой сфармуляваны агульныя мерапрыемствы, у тым ліку прыцягненне турыстычных патокаў, развіццё інфраструктуры абслугоўвання пасажыраў, грузаў, тэхнічнага абслугоўвання паветраных суднаў. Гэтая работа будзе працягнута. Сёлета добра спрацавала чартарная праграма, мы назіраем сур'ёзны рост ва ўсіх абласных аэрапортах — практычна ў два разы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Канцэпцыя прадугледжвае далейшае развіццё чартарных і рэгулярных перавозак з прыцягненнем авіякампаніі «Белавія», а таксама авіякампаній блізкага замежжа, у тым ліку лаўкост-кампаній. З авіякампаніямі Расіі, Украіны, бюджэтнымі авіякампаніямі Еўропы прапрацоўваюцца пытанні па магчымасці адкрыцця рэйсаў у абласныя аэрапорты Беларусі».

КАРАТКА

• Камбайнер СВК імя В. І. Крамко Гродзенскага раёна Андрэй Расенік *(на фота)* першым у краіне намалаціў звыш трох тысяч тон збожжа.

• **Чатыры станцыі трэцяй лініі сталічнага метро плануецца адкрыць у першай палове 2020 года.**

• У Беларусі доля безнаяўных аперацый па картках вырасла за І паўгоддзе да 53,9 %.

• **У Лагойску пабудуюць завод па вытворчасці паўфабрыкатаў для бургераў.**

• Махляр з Пінскага раёна завалодаў чужымі грашыма і маёмасцю на 350 тысяч беларускіх рублёў.

ISSN 1990 - 763X

ЛАВІСЯ, РЫБКА, ПАД... МУЗЫКУ

У пасёлку Грудзічына Быхаўскага раёна на беразе Чыгірынскага вадасховішча прайшоў X Міжнародны музычны фестываль «Вялікая бард-рыбалка».

Гасцей фестывалю парадавалі вядомыя барды, а таксама рыбалоўныя спаборніцтвы, турнір па пляжным валейболе, конкурс «Каралева бард-рыбалкі» з Наталляй Наважылавай, Кубак бард-рыбалкі па бегу, конкурс аўтарскай песні і іншае. Арганізатарамі фестывалю выступілі Магілёўскі аблвыканкам, Быхаўскі райвыканкам, абласны грамадскі савет па развіцці аграэкатурызму, творчае аб'яднанне «Сваё асяроддзе» і Палац культуры вобласці.

Фота БелТА.

Чвэрць стагоддзя 25

АПРАВА ДЛЯ ЖАМЧУЖЫН ГІСТОРЫІ

Які плён дала дзяржпраграма «Замкі Беларусі»?

Без клопату пра мінулае, без павагі да сваёй гісторыі і яе вывучэння няма будучыні ні ў адной дзяржавы. Менавіта таму дзеля захавання і па магчымасці аднаўлення архітэктурнай спадчыны ў нашай краіне была распрацаваная і зацверджаная дзяржпраграма «Замкі Беларусі».

Савет Міністраў зацвердзіў яе 6 студзеня 2012 года. Сама праграма дзейнічала з 2012-га да 2016 года, а пазней стала часткай больш маштабнай дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016—2020 гады.

Дзяржпраграма мела на мэце стварэнне спрыяльных умоў для захавання, аднаўлення і рацыянальнага выкарыстання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця ўнутранага і ўязнога турызму.

Дарэчы, паводле падлікаў даследчыкаў, у Беларусі ў розны час існавала не менш за 150 замкаў, адметных па сваёй гісторыі, архітэктурных і ландшафтных асаблівасцях. На сёння ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў — больш за 15 замкаў і іх фрагментаў, а таксама каля 20 замчышчаў — помнікаў археалогіі, што захаваліся ў культурным слаі.

СТАР. 4–5

Клімат

СЮРПРЫЗЫ НАДВОР'Я

Ці магчыма загадзя падрыхтавацца да нестандартнага лета?

Ва ўмовах змены клімату і звязаных з ёй прыродных катаклізмаў своечасовы і дакладны прагноз надвор'я становіцца ўсё больш важнай задачай. Асабліва гэта датычыцца прагнозу ападкаў.

СТАР. 9

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У БЕЛАРУСІ ЗРОБЯЦЬ ІТ-КАМБІКОРМ

Прэзідэнт надае асаблівую ўвагу высокім тэхналогіям у сельскай гаспадарцы

Стварэнне прадпрыемства заўтрашняга дня — такой мэце паслужыла прыняцце рашэння аб утварэнні Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі. Гэта нагадаў Аляксандр Лукашэнка, прымаючы адпаведны даклад у Палацы Незалежнасці.

«Задача — вытворчасць і экспарт канкурэнтаздольнай на сусветным рынку прадукцыі аграпрамысловага комплексу, што ў выніку дазволіць мінімізаваць імпарт і максімальна скараціць колькасць пасрэднікаў унутры краіны. І мяне інфармавалі, што нібыта працэс пайшоў», — адзначыў Прэзідэнт.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, пад інвестыцыйны праект «Арганізацыя высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыклу на 2016—2032 гады» прыцягнутыя крэдытныя сродкі Кітайскай Народнай Рэспублікі на даволі зручных умовах, закантрактавана абсталяванне вядучых сусветных брэндаў. Увядзенне ў эксплуатацыю мяркуецца паэтапнае, як практыкуецца паўсюдна.

«І гэта абавязкова трэба рабіць, намацваючы аб'ёмы сыравіны, якія мы можам закупіць для гэтага прадпрыемства, — нямалыя аб'ёмы. Самае галоўнае — рэалізацыя гатовага прадукту. Таму нарошчваць вытворчасць трэба як мага больш паступова», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Па яго інфармацыі, да поўнага завяршэння будаўніцтва заводы, якія дзейнічаюць, ужо будуць выпускаць прадукцыю і прыносіць прыбытак.

Налета запланаваны ўвод у эксплуатацыю комплексу камбікормавых заводаў і збожжасховішча, у 2021-м прадпрыемства запрацуе па ўсім тэхналагічным ланцужку.

«Практычна Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя — пачатак развіцця ў нашай краіне біятэхналагічнай галіны. Што больш за ўсё мяне і прывабліва, — прызнаўся Прэзідэнт. — Высокія тэхналогіі — гэта не толькі ІТ-парк, касмічная тэхніка, атамная станцыя, але і біятэхналогіі. Праект наколькі важны, настолькі і складаны. Самае важнае пытанне (бо і сыравіна знойдзецца, і аб'ект пабудуецца), галоўнае — рэалізацыя гатовай прадукцыі. Як унутры краіны, так і за яе межамі. Цана пытання — эфектыўнасць нашай сельскагаспадарчай вытворчасці і перш за ўсё жывёлагадоўлі».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: калі планавалі арганізаваць гэту вытворчасць, можа, і не ўсё разумелі. Але праз некалькі гадоў, уцягнуўшыся ў працэс будаўніцтва, шмат чаму навучыліся, можна бачыць ужо практычна ўсё: ад сыравіны да рэалізацыі гатовай прадукцыі.

«Але галоўнае паміж гэтым — кадры», — выказаў упэўненасць Прэзідэнт. Спецыялісты, якія будуць працаваць на прадпрыемстве, ужо навучаюцца за мяжой, даведваюцца пра новыя тэхналогіі, прагрэсіўную вытворчасць. Перспектыўнаму праекту патрабуецца і пастаяннае доўгатэрміновае навуковае суправаджэнне: да высокіх тэхналогій у сельскай гаспадарцы даручана далучыцца Нацыянальнай акадэміі навук, вышэйшым навучальным установам. А сістэма адукацыі павінна забяспечыць патрэбу ў кадрах праз мэтавую падрыхтоўку.

Прэзідэнт даручыў перш за ўсё ўжо зараз вывучыць сыравінныя зоны, пралічыць рынкі збыту і паклапаціцца пра якасць кармоў — не толькі «высокатэхналагічных», але і звычайных, нарыхтоўка якіх працягваецца ў гэты час.

Як паведаміў журналістам міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль Хацько, біятэхналогіі дапамогуць у вытворчасці збожжа, у кансультацыйных паслугах для вытворцаў малака і мяса.

«Гэта высокатэхналагічны праект, дзе будуць вырабляцца і амінакіслоты, і гатовыя камбікармы. Скароцім выдаткі на вытворчасць і тым самым павысім канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі. Гэта значныя крокі да імпартазамяшчэння», — расцлумачыў міністр.

Варвара МАРОЗАВА.

Па законе і ў рамках Канстытуцыі

ЦВК прапануе правесці парламенцкія выбары ў Савет Рэспублікі 7 лістапада, у Палату прадстаўнікоў — 17 лістапада, а выбарчая кампанія ў краіне можа пачацца 5 жніўня

Старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына далажыла Аляксандру Лукашэнку прапановы па даце правядзення выбараў і стратэгіі выбарчай кампаніі.

На сустрэчы ў Палацы Незалежнасці кіраўнік краіны адзначыў, што ў грамадстве ўвесь час абмяркоўваюцца тэрміны назначэння і правядзення парламенцкіх выбараў.

«Мы ўжо дакладна вызначылі, што сёлета мы праводзім парламенцкія выбары, а ў наступным годзе — прэзідэнцкія. Нягледзячы на прагнозы некаторых «знаўцаў» пра тое, што Лукашэнка ціха, спакойна, хуценька правядзе прэзідэнцкія выбары, каб зноў схапіць крэсла і на яго надоўга прысесці. Гэта поўная памылка», — звярнуў увагу кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, згодна з яго абяцаннем, усё будзе па законе, у рамках Канстытуцыі. Галоўным законам дзяржавы вызначаная колькасць дэпутатаў: 110, на думку Прэзідэнта, дастаткова для нашай краіны. Што да міжнародных назіральнікаў, «прагінацца і цягнуць кагосьці» краіна не будзе.

«Хто жадае — прыязджайце. Калі камусьці трэба афіцыйны статус — запросім. Не трэба бегчы папарадзе воза і прасіць: прыедзьце да нас на выбары, паглядзіце на нашы выбары. Але нікому забараняць не будзем! Хочаш паглядзець на Беларусь, на выбарчы працэс — прыязджай і глядзі», — абазначыў пазіцыю Прэзідэнт.

Галоўнае патрабаванне да выбарчага працэсу — правесці ўсё годна. Аляксандр Лукашэнка разумее, што крытыканы заўсёды знойдуцца, але прафесіяналы павінны ацаніць беларускія выбары.

«Я не хачу, каб нават так званая «апазіцыя» шукала нейкую падаплёку ў маіх словах наконт адкрытасці, шчырасці правядзення выбараў. Нам няма неабходнасці сёння ўжо занадта падскокваць і сябе паказваць. На імідж трэба працаваць заўсёды, але, слухайце, хто нас не ведае? Таму трэба роўна, акуратна падысці да выбараў і іх правесці. Правесці годна і дэмакратычна. Парадак і стабільнасць ляжаць у аснове. Выбары — для нашага народа, а не для кагосьці там», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Лідзія Ярмошына нагадала, што тэрмін на падрыхтоўку і правядзенне выбараў — тры месяцы.

«Калі мы гаворым пра выбары ў лістападзе, то ўжо ў пачатку жніўня павінны з'явіцца два Указы Прэзідэнта аб назначэнні выбараў, бо выбіраюцца дзве палаты», — адзначыла яна.

Як паведаміла журналістам старшыня камісіі, ЦВК прапанавала правесці выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў нядзелю, 17 лістапада, а выбары членаў Савета Рэспублікі — у святочны дзень, 7 лістапада.

«Лічым, што гэтыя даты адпавядаюць нашым традыцыям — маю на ўвазе 7 лістапада. Яны зручныя для насельніцтва з улікам таго, што святочныя водпускі і школьныя канікулы ўжо скончацца і ўсё насельніцтва ў асноўным будзе стацыянарна знаходзіцца на месцы», — растлумачыла Лідзія Ярмошына.

Па яе словах, кіраўнік дзяржавы даручыў дапрацаваць прапанову з улікам меркавання мясцовых улад і да наступнага панядзелка прадставіць праекты адпаведных указаў з канкрэтнымі датамі правядзення выбараў.

Падкрэсліла старшыня ЦВК і тое, што ў нашай краіне выбары праходзяць па самых эканомных стандартах — гэта пажаданне Прэзідэнта, трапятліва да гэтага ставіцца і насельніцтва. Выдаткі на правядзенне выбараў на кожнага выбаршчыка ў некалькі разоў ніжэйшыя, чым у суседніх краінах.

Лідзія Ярмошына далажыла Прэзідэнту і аб наваўвядзеннях, якія будуць выкарыстоўвацца на гэтых выбарах. Так, у выбаршчыкаў з'явіцца добры доступ да картаў выбарчых акруг. Ужо распрацаваныя электронныя карты, ідзе распрацоўка мабільнай праграмы, дзякуючы якой кожны грамадзянін зможа лёгка вызначыць месца знаходжання свайго выбарчага ўчастка і нават маршрут да яго. У Палацы Рэспублікі ў дзень выбараў будзе працаваць інфармацыйны цэнтр — па традыцыі, якая доўжыцца з 2001 года.

Варвара МАРОЗАВА.

ФПБ рыхтуецца да парламенцкіх выбараў

Федэрацыя прафсаюзаў прыме актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні парламенцкіх выбараў, якія павінны будуць прайсці ў лістападзе. Пра гэта паведаміў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА перад X пленумам Савета ФПБ.

Мы, як і любое цывілізаванае грамадства, жывём па законах. І якасць законаў вызначае якасць нашага жыцця. Таму вельмі важна, каб заканадаўчы орган быў высокапрафесійным, лічыць прафсаюзны лідар.

— Мы зацікаўлены ў тым, каб людзі, якія прапануюць свае кандыдатуры для абрання дэпутатамі ў Палату прадстаўнікоў 7-га склікання і будуць абраныя, ведалі сітуацыю ў працоўных калектывах, разбіраліся ў пытаннях, чулі і разумелі праблемы насельніцтва, — заявіў Міхаіл Орда. — І нам вельмі важна, каб у тых законапраектах, якія будуць прымацца, дэпутатамі ўлічвалася меркаванне прафсаюзаў і работнікаў.

Федэрацыя прафсаюзаў — адна з самых масавых грамадскіх арганізацый у краіне. Яна ніколі не заставалася ўбаку ад важных палітычных, грамадскіх падзей. І гэтым разам ФПБ плануе выкарыстаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў і прыме актыўны ўдзел у назіранні за выбарамі. «Мы падтрымаем кандыдатаў у дэпутаты і праграмы, сугучныя з кірункамі і прыцыпамі, якіх прытрымліваецца ў сваёй рабоце Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі», — адзначыў кіраўнік прафсаюзаў.

Святлана БУСЬКО.

У 2016 годзе больш за шэсць тысяч назіральнікаў ад ФПБ былі акрэдытаваны для маніторынгу парламенцкіх выбараў. У складзе ўчастковых выбарчых камісій працавала каля дзевяці тысяч прафсаюзных прадстаўнікоў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт Перу прапанаваў рэформу, якая прадугледжвае скарачэнне тэрміну яго паўнамоцтваў

Прэзідэнт Перу Марцін Віскара выступіў з ініцыятывай канстытуцыйнай рэформы, якая прадугледжвае правядзенне выбараў кіраўніка дзяржавы і парламентарыяў у 2020 годзе замест 2021-га. «Нам трэба аднавіць давер народа і паказаць краіне, што мы, нягледзячы на партыйную прыналежнасць, адзіныя ў барацьбе з карупцыяй», — сказаў Віскара падчас звароту да нацыі ў парламенце, які трансляваўся ў эфіры тэлеканала TV Peru. Праект рэформы, якая будзе азначаць скарачэнне тэрміну паўнамоцтваў прэзідэнта Перу і дзеючага складу парламента, павінен быць ухвалены падчас рэферэндуму. Перад гэтым яго павінен разгледзець Кангрэс. Па словах Віскары, ён перадасць праект рэформы ў парламент да канца тыдня. Калі яна будзе адобрана, усеагульныя выбары пройдуць у Перу 28 ліпеня 2020 года. На цяперашні момант мандат кіраўніка дзяржавы заканчваецца ў 2021-м.

МВФ шукае новага дырэктара

Выканаўчы савет Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) абвясціў аб пачатку падбору новага дырэктара-распарадчыка арганізацыі наўзамен Крысцін Лагард, якая падала ў адстаўку пасля вылучэння яе кандыдатуры на пасаду кіраўніка Еўрапейскага цэнтральнага банка (ЕЦБ), перадае ТАСС. Як паведамляе прэс-служба МВФ, савет прыняў заяву з чатырох пунктаў. У ёй адзначаецца, што «паспяховы кандыдат на пасаду дырэктара-распарадчыка» фонду павінен валодаць самай высокай прафесійнай кваліфікацыяй і «выдатным вопытам работы ў сферы фарміравання эканамічнай палітыкі на высокім узроўні». Вылучаць кандыдатаў могуць члены выканаўчага савета фонду або яго савета кіраўнікоў. Апошні орган — найвышэйшы ў іерархіі МВФ — дзейнічае на ўзроўні міністраў фінансаў або кіраўнікоў цэнтральных банкаў краін — членаў арганізацыі. Для вылучэння адводзіцца перыяд да 6 верасня 2019 года. Імёны намінантаў павінны перадавацца адказнаму сакратару МВФ, які абавязаны пераканацца, што чалавек ці людзі згодныя лічыцца кандыдатамі. Кандыдатуры да канца намінацыйнага перыяду будуць трымацца ў сакрэце.

У Японіі ўхвалілі эксперыменты па стварэнні гібрыдных эмбрыёнаў чалавека і жывёл

Вопыты будуць праводзіцца ў рамках даследавання па атрыманні донарскіх органаў. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert. Даследчыкі плануюць увесці ствалавыя клеткі чалавека ў эмбрыёны генетычна мадыфікаваных пацукоў і мышэй, у якіх не развіваецца ўласная падстраўнікавая залоза. На працягу двух гадоў навукоўцы будуць назіраць за развіццём грызуноў з чалавечай залозай, адсочваючы стан унутраных органаў, уключаючы мозг. Пасля гэтага біёлагі паставяць эксперымент на свінніх. Хоць гібрыдныя эмбрыёны чалавека і жывёл стваралі і раней, ім не дазволілі развівацца ў дарослыя асобіны. Эксперты апасаюцца, што ў грызуноў можа пачаць фарміравацца чалавечы мозг. Паводле ўмоў, калі даследчыкі выявяць, што цэнтральная нервовая сістэма паддоследных млекакормячых складаецца на 30 працэнтаў з чужародных клетак, эксперымент спыняць. Як вядома, летась японскія навукоўцы сумесна з калегамі са Стэнфарда стварылі гібрыд авечкі і чалавека, эмбрыён якога пражыў 28 дзён. Пры гэтым плод утрымліваў вельмі мала чалавечых клетак — прыкладна адну на 10 тысяч.

Прыродныя рэсурсы

З-ПАД ЗЯМЛІ ДАСТАЦЬ

Як ідуць справы ў геолагаразведцы і чаму першы конкурс з удзелам канцэсіянераў завяршыўся няўдала, расказалі прадстаўнікі Мінпрыроды ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.

Фота БелТА.

Запасы мінеральна-сыравінных рэсурсаў прырастаюць. У рамках падпраграмы «Вывучэнне нетраў і развіццё мінеральна-сыравіннай базы» рэалізуецца дзевяць комплексных мерапрыемстваў. Цяпер найбольш прыярытэтныя чатыры задачы.

Па-першае, павелічэнне здабычы і пошукаў вуглевадародnай сыравіны. Па словах **намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя ХМЕЛЯ,** да канца года будуць падлічаны запасы сыравіны на свідравіне № 1 Пералесенскай плошчы (Акцябрскі раён Гомельскай вобласці), таксама пачата бурэнне свідравіны № 4 Коўчыцкай плошчы (Акцябрскі раён Гомельскай вобласці). Дарэчы, прырост запасаў нафты фіксуецца на пастаяннай аснове.

Па-другое, працягваюцца работы па папярэдняй разведцы радовішчаў базальту і туфаў. Нагадаем, што першае радовішча гэтай сыравіны ў Беларусі было адкрыта ўсяго два гады таму ў Пінскім раёне Брэсцкай вобласці. Вынікам гэтых работ у 2020 годзе стане прырост запасаў названых карысных выкапняў.

Па-трэцяе, актыўна давыбучаюцца радовішчы кварцавага пяску.

Па-чацвёртае, вядзецца паглыблены аналіз паступлення імпартнай сыравіны ў нашу краіну. Але замяшчэнне апраўдана толькі тады, калі яно эканамічна выгадна. На прэс-канферэнцыі Андрэй Хмель надоўга закрыў «залатую тэму», паведаміўшы журналістам, што пошукі золата, медзі і ўрану ў нашай краіне неактуальныя.

Адзін з найважнейшых этапаў у пошуку мінерална-сыравінных рэсурсаў, які дазваляе вызначыць перспектыўнасць геалагічнай разведкі, — геалагічнае картаванне. Гэтая работа ўжо вядзецца ў нашай краіне, аднак яна недастаткова фінансуецца. На падпраграму па вывучэнні нетраў выдзелена ўсяго 12,5 мільёна рублёў. Між тым бурэнне адной глыбокай свідравіны абыходзіцца ў сем мільёнаў рублёў. На картаванне ж неабходна 12 мільёнаў рублёў у год, аднак бюджэт не можа выдаткаваць такую суму. Для гэтай работы немагчыма знайсці крыніцу фінансавання збоку — ніхто не гатовы марнаваць грошы, бо няма ўпэўненасці, што вывучаная тэрыторыя акажацца «залатым дном» для інвестара.

Начальнік галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль КОЛБ нагадаў, што ў нашай краіне прапануецца 15 аб'ектаў для перадачы ў канцэсію — менавіта для прыцягнення інвестыцый у геалагічнае вывучэнне нетраў, распрацоўку радовішчаў карысных выкапняў. Хоць да такой дзейнасці і была цікавасць з боку некалькіх фірмаў, аднак да ўдзелу ў конкурсе справа не дайшла. А сёлета ўпершыню з'явіўся і патэнцыйны канцэсіянер. «На жаль, з улікам таго, што быў дапушчаны шэраг недакладнасцяў пры падрыхтоўцы дакументаў з боку ўдзельніка конкурсу, ён прызнаны безвыніковым», — адзначыў Васіль Колб. Да канца года Мінпрыроды мае намер яшчэ раз абвясціць і правесці конкурсы з мэтай прыцягнення канцэсіянераў.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Абітурыент-2019

АПОШНІ ШАНЦ ТРАПІЦЬ НА «БЮДЖЭТ»

У некаторых ВНУ абвешчаны дадатковы набор на вакантныя бюджэтныя месцы. Адпаведную інфармацыю трэба шукаць на сайтах вышэйшых навучальных установ.

Так, у Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі на спецыяльнасці «аграномія» засталіся 32 свабодныя месцы. Адно вакантнае месца ёсць на спецыяльнасці «аграхімія і глебазнаўства». І 46 месцаў — на спецыяльнасці «заатэхнія». Для паступлення сюды абітурыенты павінны падаць сертыфікаты ЦТ па біялогіі і хіміі з сумай балаў не менш як сем.

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны ёсць два вакантныя месцы на спецыяльнасці «беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)».

Тры месцы засталіся незапоўненыя ў Палескім дзяржаўным універсітэце на спецыяльнасці «інфармацыйныя тэхналогіі фінансава-крэдытнай сістэмы». Форма навучання — дзённая, скарочаны тэрмін навучання (2,5 года). На вакантныя месцы могуць паступаць выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія здалі ўнутраныя пісьмовыя ўступныя выпрабаванні па «асновах алгарытмізацыі і праграмавання» і «ахове працы, ахове навакольнага асяроддзя і энергазберажэнні». Трэба мець на ўвазе, што пры паступленні на скарочаную форму навучання не мае значэння, у якой ВНУ абітурыент здаваў унутраныя ўступныя іспыты па профілі будучай спецыяльнасці.

Прыём дакументаў у рамках дадатковага набору для ўдзелу ў канкурсе на бюджэтныя месцы вядзецца з 30 ліпеня да 3 жніўня.

Залічэнне ў рамках дадатковага набору адбудзецца да 3 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

З нагоды

За сямейны быт без гвалту

Каб аказаць грамадзянам дапамогу ў вырашэнні праблем гвалту ў сям'і, а таксама з мэтай прыняцця дадатковых мер прафілактычнага ўздзеяння ў дачыненні да асоб, якія ажыццяўляюць правапарушэнні ў сферы сямейна-бытавых адносін, ва ўсіх рэгіёнах Мінскай вобласці праводзіцца спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Быт».

Праблема гвалту ў сям'і асабліва актуальная для вобласці — гэтая негатыўная з'ява патрабуе ўмяшання з боку ўсіх зацікаўленых структур, паведамляе УУС Мінаблвыканкама.

Так, па выніках трох месяцаў у рэгіёне на бытавой глебе ўжо здзейснена шэсць забойстваў і прычынена 22 цяжкія цялесныя пашкоджанні.

Больш чым у палове выпадкаў пры здзяйсненні асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынных дзеянняў у дачыненні да члена сям'і каталізатарам з'яўляўся алкаголь.

У выпадку ўзнікнення гвалту ў сям'і грамадзянам раяць звяртацца:

— у органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства альбо па тэлефоне 102;

— да спецыялістаў бясплатнай гарачай лініі для пацярпелых ад хатняга гвалту 8-801-100-8-801 (з 8 да 20 гадзін са стацыянарнага тэлефона);

— у тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе працуюць псіхолагі, спецыялісты па сацыяльнай рабоце, юрысты;

— у медыцынскія ўстановы (па медыцынскую дапамогу, зафіксаваць пабоі, цялесныя пашкоджанні ці іншую шкоду здароўю).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Трэба ведаць

Прававая падтрымка — прызыўнікам

Дамоўленасць аб аказанні адвакацкай прававой падтрымкі прызыўнікам і Міністэрству абароны па пытаннях вайсковай службы дасягнута паміж Беларускай рэспубліканскай калегіяй адвакатаў (БРКА) і Міністэрствам абароны, паведаміў БелТА старшыня БРКА Віктар Чайчыц.

Адвакаты акажуць прававую дапамогу ў рабоце прызыўных камісій краіны, а таксама самім прызыўнікам. «Наша галоўная мэта — растлумачыць людзям неабходнасць выканання закона па пытаннях вайсковай службы, агарадзіць іх ад магчымых памылак і незаконных дзеянняў», — адзначыў Віктар Чайчыц.

Паводле яго слоў, у апошні час у краіне з'явілася нямала лжэюрыстаў, гатовых аказаць так званую дапамогу асобам прызыўнога ўзросту ў атрыманні адтэрміноўкі ад службы ў арміі ці ў тым, каб зусім пазбегнуць службы. Часцей за ўсё прапануюцца незаконныя спосабы, за якія потым прыйдзецца несці адказнасць самому прызыўніку. Адвакаты растлумачаць людзям, у якіх выпадках адтэрміноўка законная і якія наступствы могуць наступіць у выпадку парушэння закона.

Здарэнне

Трое сутак без вады і ежы

На Магілёўшчыне знайшлі зніклага мужчыну

Грамадзянін 1935 года нараджэння выйшаў са свайго дома ў абласным цэнтры, накіраваўся ў бок мікрараёна Грэбянёва і... знік.

Работнікі МНС і МУС абследавалі тэрыторыю лесу паблізу названага месца, аднак пошукі выніку не далі. Як паведамілі ў МНС, далей паспрабавалі ўстанавіць пункт уваходу мужчыны ў лясны масіў: яна знаходзілася за 300 метраў ад канцавога прыпынку аўтобуса і пралягала праз прыватны сектар. Па гэтым маршруце ратавальнікі выявілі камеры відэаназірання. Атрымаўшы доступ да відэафайлаў, яны ўстанавілі, што на адрэзку часу з 12 да 16 гадзін чалавек з адпаведным вонкавым выглядам у бок лесу не праходзіў. Зыходзячы з атрыманай інфармацыі, далейшае прачэсванне лясnога масіву ратавальнікі палічылі немэтазгодным.

Прааналізаваўшы ўсе зыходныя даныя, работнікі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння прынялі рашэнне аб неабходнасці правядзення пошукавых работ не ў лясным масіве, а ў пойменным лузе плошчай тры квадратныя кіламетры. На дапамогу прыбылі дадатковыя сілы ў колькасці 20 работнікаў МНС і 23 супрацоўнікаў міліцыі.

Дзякуючы гэтым дзеянням быў дакладна ўстаноўлены пункт уваходу, і 83-гадовы мужчына быў знойдзены жывым. Высветлілася, што трое сутак без ежы, вады і сродкаў сувязі ён правёў у забалочанай мясцовасці, бо ў яго адмовілі ногі і ён не мог рухацца. Мужчыну была аказана першая медыцынская дапамога, і на насілках ён быў дастаўлены да ўсюдыхода, на якім яго і перадалі медыкам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Як нас дураць

Элін, яна ж Ева, яна ж Яна...

Махлярка прадстаўлялася як жанчынай, так і мужчынам

Сталічная міліцыя і АМАП затрымалі 44-гадовую масквічку, якая ў інтэрнэце пад выглядам розных людзей здзяйсняла ашуканскія дзеянні ў дачыненні да беларусаў і грамадзян іншых дзяржаў. Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

Злачынная схема, па якой працавала жанчына, была пабудавана па прынцыпе сацыяльнага інжынірынгу. У інтэрнэце фігурантка збірала інфармацыю пра людзей з праблемамі са здароўем. Далей у сацыяльных сетках яна прапаноўвала дружбу патэнцыйнай ахвяры, а затым «апрацоўвала» яе некалькі месяцаў.

Грошы жанчына выманьвала, выдумляючы розныя гісторыі: патрэбныя сродкі, каб вылечыць рак, з'ехаць на заробкі, купіць бытавую тэхніку. Расказвала яна і такія «казкі», у якіх рабіла акцэнт на роднасных сувязях і знаёмствах з высокапастаўленымі чыноўнікамі.

У перапісцы зламысніца прадстаўлялася як мужчынам, так і жанчынай з Польшчы, Украіны, Латвіі, Вялікабрытаніі. Выкарыстоўвала псеўданімы Abigail Paten, Элін, Эля, Ева, Яна, Jadviga Tocka, Denis Paten.

Так, у маі мінулага года адной з пацярпелых у сацсетцы прыйшло паведамленне ад нейкага Denis Paten, жыхара Рыгі, які нібыта хварэе на рак селязёнкі. Праз тры месяцы стасункаў у інтэрнэце мужчына папрасіў новую знаёмую дапамагчы грашыма. 1600 рублёў яму «патрабавалася» на лекі і лячэнне ў анкалагічным цэнтры. Па тэлефоне Denis Paten паведаміў пацярпелай, што грошы забярэ яго знаёмая Элін.

Менш чым за паўгода махлярка завалодала грашыма мінчан на агульную суму 10 850 рублёў, 2100 долараў і 420 еўра. Было ўстаноўлена, што Элін была якраз тая зламысніца, якая раней называла сябе Denis Paten.

Цяпер аператыўнікі ўстанаўліваюць іншых асоб, якія маглі пацярпець ад яе дзейнасці. Усе матэрыялы праверкі перададзены ў УСК па Мінску для дачы прававой ацэнкі дзеянням фігуранткі. Супрацоўнікі міліцыі просяць усіх пацярпелых грамадзян або тых, хто мае інфармацыю аб дзейнасці махляркі, паведаміць па тэлефоне 102.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РЭНЕСАНС КРАІНЫ

Як на Гродзеншчыне клапоцяцца аб захаванні архітэктурных

РЭГІЁН без перабольшвання можна назваць краінай замкаў. Тут іх канцэнтрацыя — самая вялікая ў Беларусі. А ўсяго занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў 700 аб'ектаў, з іх палова — помнікі архітэктуры. І гэты спіс папаўняецца. Напрыклад, нядаўна яшчэ 35 аб'ектаў — цэрквы, касцёлы, фамільных пахаванняў, будынкаў — рашэннем урада занесена ў нацыянальны рэестр.

Стары замак у Гродна.

Фота Мікалая ЛАПІНА.

Самыя знакавыя аб'екты праходзяць рэстаўрацыю, на што выдаткоўваюцца мільёны рублёў дзяржаўных сродкаў. Але ў краіне ідуць на гэта, каб захаваць багатую спадчыну, якая з'яўляецца як справай гонару, так і прывабным сродкам для турыстаў.

Аб тым, якая работа вядзецца ў рэгіёне ў гэтым кірунку, расказала **начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена КЛІМОВІЧ.**

Ад Мірскага замка да рэзідэнцыі караля ў Гродне

Мірскі замак — прыклад таго, як працуе старажытны комплекс на эканоміку краіны. Праўда, аб'ект мае рэспубліканскае падпарадкаванне, хоць знаходзіцца на тэрыторыі вобласці. У 2000 годзе Мірскі замак унесены ў Спіс помнікаў ЮНЕСКА. Гэта адбылося пасля таго, як комплекс прайшоў маштабную рэканструкцыю. Цяпер сюды ў год прыязджае да 300 тысяч турыстаў.

— А яшчэ гадоў 30 таму турыстычны паток быў невялікі, але ўсё змянілася пасля таго, як комплекс аднавілі. Сёння яго нават цяжка параўнаць з тым замкам, які быў у 70—80-я гады, — гэта каласальная розніца, — кажа Алена Клімовіч. — Цяпер гэта вялізны турыстычны комплекс, які папулярызуе нашу спадчыну, культуру. Тут ладзяцца вялікія фестывалі і святы, сюды любяць прыязджаць і беларусы, і замежнікі.

А галоўнае — комплекс працуе на эканоміку, расце прывабнасць не толькі рэгіёна, але і ўсёй краіны. І гэта пры тым, што пры рэканструкцыі гучала нямала крытыкі ў адрас новага праекта. Але прафесіянальны падыход перамог, і цяпер можна казаць аб тым, што ўкладзеныя дзяржаўныя сродкі сябе цалкам апраўдалі.

Нямала спрэчак выклікала і рэканструкцыя знакавай святыні — Старога каралеўскага замка ў Гродне. Праект быў «замарожаны» на доўгі час і некалькі гадоў таму нарэшце вярнуўся ў работу. Было вырашана прывесці замак у адпаведнасць з эпохай караля Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя. Пры ім будынак з шэрага абарончага комплексу ператварыўся ў велічны палац. Праўда, ненадоўга, бо войны і пажары зноў вярнулі яму від казармы. І вось зараз прыкладаюцца намаганні, каб замак прыняў аблічча каралеўскай рэзідэнцыі XVI стагоддзя.

Прыгажосць крыецца ў дэталях

Работы вядуцца некалькі гадоў. Выгляд замка ўсё больш набліжаецца да палаца. З'явіліся сцяна, вежа, галерэя, ён стаў вышэйшы. Зараз пачаўся важны этап — гералдычнае афармленне ўязной брамы. Пасля кансультацыі са спецыялістам па гераьдыцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі распрацавана прапанова размясціць на браме герб Вялікага Княства Літоўскага — Пагоню, Рэчы Паспалітай — двухгаловага арла і радавы герб Стафана Баторыя — зубы дракона. Праект прадстаўлены на разгляд у Міністэрства культуры.

— Была прапанова размясціць толькі радавы герб караля, без дзяржаўнай сімволікі, але гэта не зусім правільна, бо замак — не радавое гняздо, а дзяржаўная ўстанова, — падкрэсліла Алена Клімовіч.

Яшчэ адзін спрэчны момант — купал на вежы. На яго звярнулі ўвагу польскія спецыялісты, члены беларуска-польскай кансультатыўнай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Яны прапануюць зрабіць купал больш выцягнутым і паменшыць яго памеры. Дарэчы, на спецыяльна створанай старонцы ў сацыяльных сетках таксама вядзецца абмеркаванне формы будучага купала.

— Мы працавалі па розных крыніцах — нямецкіх, польскіх. Але дакументаў мала, толькі гравюра Макоўскага. Наогул невядома, хто на самай справе быў архітэктарам палаца — італьянец Санці Гучы ці немец Ёзэф Ройтэн, — расказвае Алена Клімовіч. — Таму вывучаюцца аналагі. Мы прыслухоўваемся да думкі польскіх спецыялістаў, якія раяць паменшыць памеры купала і змяніць яго форму.

Паралельна вядзецца распрацоўка інтэр'ераў. Тут таксама патрэбна дасканаласць: які выгляд мела рашотка каля ўвахода, якія былі абрамленне столі, вокнаў, насценны жывапіс. Як выглядалі мэбля, люстры, каміны... Некаторыя дэталі пераймаюцца з падобных замкаў Літвы і Польшчы. Такім чынам удалося ўзнавіць — пакуль на паперы — алебастравую залу і каралеўскую лазню. Магчыма, да стварэння інтэр'ераў змогуць далучыцца польскія і венгерскія спецыялісты. Як вядома, Стафан Баторый быў па нацыянальнасці венграм.

— Усё гэта будзе ствараць музейную экспазіцыю, — заўважае супрацоўніца Алена Клімовіч. — Разам з узноўленым інтэр'ерам будуць прадстаўлены і археалагічныя знаходкі, таксама і тыя рэчы, якія ёсць цяпер у музеі Старога замка.

Дарэчы, раскопкі дазволілі выявіць, што аздабленне замка вялося з пясчаніку. Так робіцца і зараз, а сам выкапень прывозяць з Польшчы. У хуткім часе рэстаўратары прыступяць да абрамлення вокнаў і столяў. Для ўзнаўлення печаў ёсць намер прыцягнуць спецыяліста, які рабіў такі заказ у Мірскім і Нясвіжскім замках. У Гродне, праўда, будуць свая форма і свой малюнак.

Вядома, аднавіць такі аб'ект — справа не толькі доўгая, але і затратная. За гэты час выдаткавана 3,2 мільёна рублёў дзяржаўных сродкаў. Зараз выдзелена яшчэ 1,5 мільёна, палова з якіх таксама асвоена.

— Безумоўна, гэта дорага. Але калі прыняць да ўвагі, што ў турыстычна развітых краінах кожны дзясяты заняты ў гэтай сферы, атрымліваецца значная частка эканомікі. Але для таго, каб развіваць турызм, трэба мець пад сабой базу.

Паколькі Стары замак з'яўляецца адной з чатырох каралеўскіх рэзідэнцый, якія дайшлі з таго перыяду (тры з іх знаходзяцца ў Вільні, Варшаве і Кракаве), ідзе гаворка аб стварэнні адзінага міжнароднага турыстычнага маршруту па трох краінах. Усе палацы ў свой час прайшлі значную рэканструкцыю.

Лідскі замак.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Трывалы падмурак Каложы

Некалькі гадоў таму самы старажытны аб'ект рэгіёна быў узяты пад кантроль дзяржавы. На рэканструкцыю Каложскай царквы з фонду Прэзідэнта было выдаткавана каля 200 тысяч рублёў. Значная частка сродкаў паступіла з абласнога бюджэту.

У выніку ўдалося ўмацаваць фундамент, надаць трываласць каркаснай канструкцыі і замяніць былую драўляную сцяну новай.

Знакаміты помнік XII стагоддзя з'яўляецца ўзорам гродзенскай архітэктурнай школы. Ён хоць і дайшоў да нашых часоў, але некалькі разоў быў пад пагрозай знішчэння. А ўсё таму, што знаходзіцца на самым схіле Нёмана. Менавіта рака стала прычынай самага буйнога разбурэння падчас паводкі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Тады ў Нёман «спаўзла» значная частка будынка.

Цяпер драўляную сцяну, а гэта 180 «квадратаў», цалкам замянілі. Абшыўка выканана з тэрмамадыфікаванай хвоі — дрэва не баіцца ні вільгаці, ні марозаў, ні сонечных промняў. Такім чынам, аварыйны стан больш не пагражае канструкцыі храма.

— Стаіць пытанне, як захаваць аўтэнтычную сцяну, плінфу — тую самую старажытную кладку. Яна хоць і прастаяла 800 гадоў, але ў некаторых месцах цэгла сыплецца, таму ўзнікае пытанне: ці трэба яе пакрываць растворам? Ці не пашкодзіць яго састаў старажытную плінфу? Зараз гэта абмяркоўваецца спецыялістамі, — паведаміла Алена Клімовіч.

Магчыма, такія работы будуць весціся на асобных участках у якасці эксперымента з вывучэннем замежнага вопыту.

Дарэчы, падрыхтавана дасье для ўключэння помніка архітэктуры ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Бо храм сапраўды ўнікальны. Калі зайсці ў яго, можна ўбачыць шмат цудоўнага. Гэта і шкляная падлога з падсвет-

Крэўскі замак.

Фота Бела ГА.

кай, пад якой бачны рэшткі старажытнага фундамента, і мазаіка расійскага мастака Віктара Васняцова, вядомага сваімі карцінамі «Алёнушка», «Асілкі», «Іван-царэвіч і шэры воўк». Калісьці мазаіка з выявай святых упрыгожвала сабор у Варшаве, але ў 20-х гадах ён быў разбураны, і фрагмент палатна трапіў у Каложу. Тут знаходзіцца вялікая ікона, якая была раней у Свята-Сафійскім саборы, вядомым як Фара Вітаўта. Лёс гэтага храма трагічны: у 1961 годзе яго ўзарвалі, частку прадметаў удалося выратаваць.

Многія гродзенцы ведаюць гісторыю стварэння дубовага іканастаса. Сродкі на яго ахвяраваў Уладзімір Мулявін, які часта прыязджаў у Гродна і заходзіў у храм. Дарэчы, у гэтым горадзе ён пазнаёміўся з трэцяй жонкай, якая адсюль родам.

— У храм часта прыходзяць турысты, мы іх сустракаем добразычліва, — кажа **настаяцель Аляксандр БАЛОННІКАЎ.** — Калі няма службы, я сам стараюся расказаць ім пра нашу ўнікальную святыню, адказаць на пытанні. Імкнёмся зрабіць усё, каб храм быў для гасцей горада і краіны месцам найлепшых уражанняў аб беларусах.

ЗАМКАЎ помнікаў

Каложа.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гальшанская панна ці манах?

Ад велічнага некалі старажытнага замка Сапегаў у Гальшанах засталіся адны руіны. Але не ўсё страчана. Адна вуглавая вежа ўсё ж захавалася, і зараз тут вядуцца аднаўленчыя работы.

Вежа будуецца з той цэглы, якую знайшлі ў замку, адным з самых таямнічых старажытных аб'ектаў. Нездарма беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч абраў яго месцам дзеяння для свайго вядомага рамана «Чорны замак Альшанскі». Міжволі малюцца постаці панны і чорнага манаха... Алена Клімовіч вяртае да рэчаіснасці, але захоўвае інтрыгу.

— Вежа амаль завершана, вядзецца мантаж лесвіцы, па якой турысты змогуць трапіць унутр. Там з'явіцца музейная экспазіцыя ў тры ярусы. Задзейнічаюць і падвал. Менавіта тут з дапамогай сучасных тэхналогій мяркуецца стварыць тую атмасферу таямніцы, якая суправаджае гісторыю былога палаца. Таксама можна будзе даведацца аб асаблівасцях замка, убачыць яго макет. Асобны ярус будзе прысвечаны яго заснавальніку з роду Сапегаў, — кажа суразмоўніца.

Астатнюю частку Гальшанскага замка закансервуюць. Такі ж падыход чакае і руіны былога Краўскага замка. Яго будаваў Гедымін для абароны ад тэўтонцаў. Разам з Навагрудкам і Лідай замак стварау так званы Каменны пояс. На кансервацыю руін у Крэве, як і ў Гальшанах, выдзелены сродкі таксама з фонду Прэзідэнта.

Справа паступова рухаецца. Завяршылася кансервацыя паўночна-заходняй сцяны і распрацаваны праект на наступную. Такім чынам будуць узноўлены ўсе муры па перыметры, затым пачнуцца работы па Княжацкай вежы.

Прынцып узнаўлення такі: захаваць менавіта старыя муры, аўтэнтычную кладку. Цэгла выраблянца ўручную, не патокам. Бо тут экспанаты — менавіта самі сцены замка, а не музейныя экспазіцыі.

Раённая ўлады настроены на тое, каб максімальна задзейнічаць замак у турыстычных мэтах. Для гэтага распрацавана некалькі анімацыйных праграм, якія турысты могуць заказаць разам з экскурсіяй.

Замак, Гедымін і культурная сталіца

Усё гэта — Ліда, якая ў 2020 годзе стане культурнай сталіцай Беларусі. А сёлета тут будзе ўстаноўлены шматметровы помнік заснавальніку горада і замка — князю Гедыміну. Сам замак, хоць і быў дабудаваны ў розныя часы, захаваўся ў добрым стане. Яго выгляд падкрэслены будаўніцтвам уязной вежы, дзе будзе створана музейная экспазіцыя.

Лідскі замак — адзін з самых папулярных па наведванні. Гэта звязана з самой пляцоўкай унутры замка, дзе праходзяць інтэрактыўныя экскурсіі, тэатралізаваныя прадстаўленні, пляцоўка запатрабавана для правядзення платных мерапрыемстваў. Танцы, конкурсы і выступленні рыцарскіх клубаў — прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў арганізацыі турыстычнай прывабнасці гістарычнага аб'екта.

У тэму:

У рэгіёне імкнуцца знайсці гаспадароў былым панскім сядзібам. Такім чынам прыдбана сядзіба роду Сегеняў у вёсцы Краскі Ваўкавыскага раёна. Там вядуцца аднаўленчыя работы. У гэтым жа раёне ў Падароску добра ідзе справа па адраджэнні сядзібы Бохвіцаў. Абедзве сядзібы набылі расійскія бізнесмены і плануюць зрабіць з іх турыстычныя комплексы.

Велічны палац Умястоўскіх — помнік сядзібна-паркавай архітэктуры — нейкім цудам захаваўся ў маленькай вёсцы Жамыслаўль Іўеўскага раёна. Не адразу, але з'явіліся зрухі ў аднаўленні палаца. Яго купіла мінская фірма, і тут вядуцца работы па даху. Ідзе распрацоўка праекта па рэканструкцыі будынка. І ўжо вясной на сядзібе прайшло свята з удзелам мясцовых жыхароў.

А вось сядзіба Чацвярцінскіх у пасёлку Жалудок Шчучынскага раёна пакуль без гаспадара. Яна таксама вельмі велічная, але патрабуе значных сродкаў. Расійскі бізнесмен, які ўзяўся за гэтую справу, не адолеў яе.Таму вядзецца работа па вяртанні будынка. Пытанне аб узнаўленні велічнага палаца застаецца адкрытым.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

АПРАВА ДЛЯ ЖАМЧУЖЫН ГІСТОРЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дзяржпраграма «Замкі Беларусі» прадугледжвала правядзенне рэстаўрацыйных работ і мерапрыемстваў па кансервацыі на 14 замках і палацах — з захаваннем іх кампазіцыйнай структуры і гістарычнай забудовы, а таксама прыстасаванне іх для сучасных сацыяльна-культурных патрэб.

На працягу трох гадоў адпаведныя мерапрыемствы ў межах выдзеленых сродкаў праводзіліся на ўсіх аб'ектах, што былі ўключаны ў дзяржпраграму. У прыватнасці, адзначае **начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Беларусі Наталля ХВІР,** у 2015 годзе былі завершаны работы на чатырох аб'ектах: Камянецкай вежы ў Камянцы, рэштках замка ў вёсцы Геранёны Іўеўскага раёна, у палацава-паркавым ансамблі ў Нясвіжы, а таксама ў парку з рэшткамі замка ў пасёлку Тэльман Брагінскага раёна Гомельшчыны. На двух аб'ектах — руінах замка Белы Ковель у аграгарадку Смальяны Аршанскага раёна Віцебшчыны і руінах адзінага захаванага ў нашай краіне замка-крэпасці XVII стагоддзя ў Быхаве Магілёўскай вобласці — было праведзена добраўпарадкаванне.

Яшчэ ў васьмі замках і палацах — у Гродне, Навагрудку, Любчы (Навагрудскі раён), Крэве (Смаргонскі раён), Гальшанах (Ашмянскі раён), Міры (Карэліцкі раён), Лідзе, Ружанах — работы па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў архітэктуры працягнуліся і ў 2016—2018 гадах. Прычым за гэты тэрмін на захаванне аб'ектаў культурнай спадчыны было вылучана звыш трох мільёнаў рублёў з рэспубліканскага бюджэту, больш за 1,2 мільёна — з мясцовых, яшчэ звыш 300 тысяч рублёў паступіла ад спонсараў у межах дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Дадаткова за кошт сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва фінансаваліся кансервацыя і аднаўленне фрагментаў Крэўскага і Гальшанскага замкаў. Дарэчы, савет фонду сёлета ў сакавіку прыняў рашэнне выдзеліць на заканчэнне гэтых работ у 2019—2020 гадах яшчэ больш за 1,9 мільёна рублёў. Так што, нягледзячы на тое што афіцыйна дзеянне дзяржпраграмы «Замкі Беларусі» завершана, работы па захаванні культурна-гістарычных помнікаў у розных рэгіёнах краіны працягваюцца — і значыць, усё новыя знакавыя аб'екты будуць уключацца ў турыстычныя маршруты для беларусаў і замежных гасцей.

Каментарый у тэму:

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы, доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі навук Ігар МАРЗАЛЮК:

«Найвялікшы наш здабытак за 25 гадоў прэзідэнцтва — архітэктурны суверэнітэт»

— Я не раз казаў, што самае каласальнае дасягненне за 25 гадоў інстытута прэзідэнцтва ў Беларусі — гэта наш рэальны архітэктурны суверэнітэт. Для мяне гэты суверэнітэт вызначаюць дзве знакавыя рэчы: рэстаўрацыя замкаў і аднаўленне ратуш, бо замкі і ратушы — маркеры еўрапейскай беларускай гісторыі. Гэта тое, чаго няма ў суседняй Расіі ў сілу таго, што яна развівалася іначай у гістарычным плане: там ніколі не было самакіравання і не было феадалізму ў класічным сэнсе слова. А ў нашай краіне ёсць такая адметнасць, якая лучыць нас з Усходам і Захадам, з еўрапейскай культурнай традыцыяй. І калі ўважліва вывучыць пытанне, вы пабачыце, што менавіта за 25 гадоў прэзідэнцтва, пачынаючы з 1994 года, мы аднавілі, адрэстаўравалі столькі знакавых беларускіх помнікаў, колькі не зрабілі за ўсё XX стагоддзе. Можна спрачацца, наколькі хораша і прыгожа было зроблена тое ці іншае, але Беларусь узнавіла гэты велічны сілуэт, і для мяне гэта самае важнае.

Фота БелТА

Ляпніна Жыліцкага палацавага комплекса.

Разам з тым я лічу, што ёсць яшчэ знакавыя помнікі, якія трэба ўключаць у інвестыцыйныя праграмы і развіваць работу на іх. Якія аб'екты, на маю думку, недаацэненыя належным чынам, не ўведзеныя ў нацыянальны кантэкст? Буду казаць пра любую майму сэрцу ўсходнюю Беларусь. Тут ёсць тры эталонныя помнікі, якія нічым не саступаюць ні Нясвіжу, ні Міру ці іншым вядомым комплексам.

Безумоўна, у гэты пералік уваходзіць комплекс архітэктурных помнікаў Мсціслава, у тым ліку знакамітыя Пустынкі. Мсціслаў — наогул унікальны горад і раён, горад-помнік, роўнага якому на ўсходзе і паўднёвым усходзе Беларусі няма. Туды трэба выдаткаваць каласальныя грошы, і зрабіць гэта можа толькі дзяржава, каб надаць Мсціславу высокі статус гісторыка-археалагічнага запаведніка.

Быхаўскі замак — таксама ўнікальны, адзіны захаваны ў нашай краіне замак-крэпасць галандскага тыпу, што сведчыць аб сувязях з Фландрыяй, з Нідэрландамі. Да таго ж гэта замак двух самых вядомых беларускіх радоў — Хадкевічаў і Сапегаў. Сюды ж далучым і Быхаўскую сінагогу абарончага тыпу — такіх было ўсяго тры, іншыя дзве знаходзіліся ў Пінску і Вільні, але яны разбураныя, а быхаўская захавалася. Старыя Быхаў таксама патрабуе велізарнай працы і ўкладанняў, аднак я перакананы, што калі падысці да яго з такім жа клопатам і любоўю, як мы падышлі да Міра і Нясвіжа, то ён гэтыя грошы верне за некалькі гадоў, бо мае вялікі турыстычны патэнцыял.

І, нарэшце, трэці ў спісе аб'ект — Жылічы. Няхай не пакрыўдзяцца на мяне жыхары гарадоў з вядомымі палацавымі комплексамі, аднак калі ў многіх з іх ад гісторыі засталіся толькі сцены, то Жыліцкі палацавы комплекс, пабудаваны Янам Булгакам, — месца, куды трэба прыехаць, каб пабачыць прыгажосць і багацце сапраўднай гісторыі: ляпніну пачатку XIX стагоддзя, столь, якая захавалася мо толькі ў Эрмітажы, вінтавыя лесвіцы... Гэта знакавы помнік архітэктуры, на сённяшні дзень, напэўна, самы аўтэнтычны ў Беларусі, перліна нумар адзін. Менавіта гэтыя помнікі, пры ўсёй павазе да іншых, павінны мець прыярытэт у пытаннях аднаўлення.

светам. Гэта наша «самасць», наша беларускасць, той непаўторны культурны код, па якім нас будуць пазнаваць у свеце. Бо з іншых краін людзі прыязджаюць паглядзець на тое, чаго няма ў сябе, — і вось гэтага больш нідзе няма, як у нас.

— На ваш погляд, наколькі паспрыяе ў справе рэстаўрацыі замкаў і іншых архітэктурных помнікаў распрацоўка віртуальных праектаў, па прыкладзе Нотр-Дам дэ Пары?

— Я лічу, што і віртуальныя праекты — вельмі важная рэч, але ніякі віртуальны праект не заменіць рэальнай рэстаўрацыі. Іншая справа, што заўсёды ўзнікае спрэчка: ці трэба аднаўляць усе помнікі, ці дастаткова правесці кансервацыю — калі будынак памёр, пражыў свой век, то зафіксуем руіны і далей не пойдзем? Гэты падыход таксама мае месца быць. Аднак ёсць помнікі, якія больш чым проста помнікі — яны знакі мемарыяльнай культуры. Вось прыклад: Варшава была цалкам разбомбленая, і калі сёння прайсці па Старым Мясце — гэта ўсё навадзел, рэканструкцыя. Але палякі зрабілі яе дакладна па чарцяжах і малюнках таго часу, і ў каго павернецца язык упікнуць іх у навадзеле? Альбо чаму сабор Нотр-Дам дэ Пары будзе ўзноўлены абавязкова — таму, што для французаў ён і ёсць Францыя; гэта не толькі сэрца краіны, але і цэнтр парламентарызму, найважнейшы момант французскага каралеўства, маса сімвальных падзей. Так і ў нас ёсць замкі, якія нясуць сімвалічны змест для Беларусі. Таму, я лічу, трэба праводзіць і рэстаўрацыю, і кансервацыю — у залежнасці ад статусу і важнасці аб'екта, але ёсць будынкі, якія незалежна ад выдаткаў і цяжкасці працы абавязкова трэба аднаўляць. Бо без іх няма нас.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Памяць

ПАЛОННАЯ ПРАЎДА

У кожнага народа свая памяць пра вайну. У Беларусі Вялікая Айчынная вайна закранула кожную сям'ю. Сотні тысяч нашых прадзедаў ваявалі ў Чырвонай Арміі і ў партызанах, жыхары гарадоў і вёсак станавіліся сведкамі жахлівых злачынстваў, што тварыліся акупантамі, людзі ведалі, якой цаной давалася перамога. Дзеці і моладзь выхоўваліся на аповедах відавочцаў. Але як падаваць ваенную гісторыю сучаснай моладзі, тым больш, калі сыходзяць не толькі сведкі, але і пакаленне, якое бачыла і размаўляла з удзельнікамі тых падзей.

Ці змогуць маладыя людзі сарыентавацца ў тым неверагодным патоку інфармацыі ў замежных СМІ і інтэрнэце, да якіх у іх сёння ёсць доступ? Ці здольны яны самастойна адфільтраваць інфармацыю, адрозніць фальсіфікацыі і скажоныя рэаліі? **Навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Алена ТРУБЧЫК** упэўнена, што дзяржава і сістэма адукацыі павінны больш увагі аддаваць кантролю за тым, што ўваходзіць у галовы маладых людзей. Яе засмучае той факт, што ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах перасталі выкладаць курс, прысвечаны гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, што ў школьных праграмах недастаткова гадзін даецца на вывучэнне гэтай тэмы, а ў метадычных рэкамендацыях да школьных падручнікаў пазначана, што некаторыя пытанні можна не разглядаць падрабязна (напрыклад, акупацыйны рэжым і вызваленне Беларусі), а аб'ядноўваць з іншымі. Сёння, каб выхоўваць новае пакаленне, неабходна шукаць новыя сродкі і падыходы, аб'ядноўваць намаганні педагогаў і вучоных, грамадскіх арганізацый і СМІ. І натуральна, у такі час патрэбны будуць новыя кнігі пра вайну.

І сёння выдаўцы ведаюць, як падладзіцца пад патрэбы пакалення з кліпавым мысленнем. Серыя «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці» выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» якраз разлічана на моладзь. Невялікія па фармаце, сучасна афармленыя, з кароткімі ёмкімі тэкстамі, багата аздобленыя ілюстрацыямі, кнігі распавядаюць пра тое, што давялося перажыць нашым папярэднікам. Факты, якія прыводзяцца ў іх, прымушаюць страсянуцца, задумацца над тым, якія жахі нясе вайна. Кнігі з вышэйзгаданай серыі «Хатынь. Трагедыя беларускага народа», «Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы», «Боль і гнеў. Халакост і супраціўленне ў Навагрудку» ўжо атрымалі шырокае прызнанне ў краінах СНД і адзначаны найлепшымі ў намінацыі «Перамога» Міжнароднага конкурсу дзяржаў — удзельніц СНД «Мастацтва кнігі — 2019».

А нядаўна выдавецтва прэзентавала яшчэ адну навінку — «Масюкоўшчына. Трагедыя савецкіх ваеннапалонных»

ЗАМОРАНЫЯ ГОЛАДАМ І ХОЛАДАМ

У 1941 годзе ў палон патрапіла 3,4 мільёна салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі. Да канца студзеня 1942-га з іх у жывых засталося толькі 1,4 мільёна. Астатнія былі расстраляны, закатаваны, памерлі ад холаду, голаду і хвароб у нацысцкіх лагерах ці падчас транспарціроўкі ў месцы зняволення. Звыш 800 тысяч ваеннапалонных (і гэта лічба не канчатковая, некаторыя гісторыкі ўжо называюць і 900 тысяч) было знішчана захопнікамі на тэрыторыі Беларусі.

На жаль, за савецкім часам гаварыць пра забойствы ваеннапалонных не было прынята. І хоць пакутніцкая смерць у палоне здрадай не лічылася, пра ўшанаванне памяці такіх ахвяр у Савецкім Саюзе асабліва не гаварылі. З гэтай тэмай амаль не працавалі даследчыкі. На месцах масавых забойстваў ваеннапалонных не ставілі мемарыялаў. Таму новая кніга выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» будзе цікавая не толькі жыхарам нашай краіны, тым больш, што на беларускай зямлі загінулі прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў.

Лагер у Масюкоўшчыне (шталаг № 352) быў адным з найбуйнейшых у Беларусі па колькасці знішчаных савецкіх ваеннапалонных. З ліпеня 1941 да ліпеня 1944 года ў ім загінула больш за 80 тысяч чалавек. Найбольш жахлівай стала першая ж «палонная» зіма — людзі масава паміралі ад голаду і холаду. Фашысты спрабавалі схаваць гэтае злачынства, але адразу пасля вайны былі знойдзены закапаныя імі скрыні з дакументамі, якія пацвярджалі факты смерці ваеннапалонных ад знясілення.

Лагер складаўся з дзвюх частак. Адна размяшчалася ў горадзе ў межах вуліц Калініна — Якуба Коласа. (Дарэчы, выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» якраз размяшчаецца ў тых мясцінах, дзе чыніліся злачынствы і дзе былі пахаваны ахвяры тэрору — былая так званая «могілкавая горка»). У гэтай частцы лагера загінула каля 10 тысяч ваеннапалонных. У разы больш ахвяр было знішчана ў другой частцы лагера, якая размяшчалася за гарадам на месцы былога ваеннага гарадка (сёння гэта прыпынак электрычкі «Масюкоўшчына»).

Аўтар кнігі — **загадчык аддзела навукова-даследчыцкай работы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Наталля ЯЦКЕВІЧ,** дапамогу аказалі архівы і ўпраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны Узброеных Сіл, пад кіраўніцтвам якога праводзіліся раскопкі ў Масюкоўшчыне. У кнізе размешчаны фатаграфіі, якія пацвярджаюць масавыя забойствы ваеннапалонных. Захаваліся паказанні сведак і газета «Палонная праўда», што ўпотай стваралася зняволенымі.

«Многія пабудовы лагера ваеннапалонных у Масюкоўшчыне можна бачыць і ў наш час, — заўважае **вядучы навуковы рэдактар выдавецтва, рэдактар кнігі Міхаіл НІКІЦІН.** — Па вуліцы Якуба Коласа — гэта трохпавярховыя казармы (раней лазарэт), адкуль вынеслі 10 тысяч загінулых, і ў самой Масюкоўшчыне захаваліся трохпавярховыя казармы, цяпер паўразваленыя, адкуль вынеслі загінулых ад нечалавечых умоў не менш за 50 тысяч чалавек у першую ж ваенную зіму. Таксама на тэрыторыі ваеннага гарадка Масюкоўшчына захаваліся сталовая і аб'ект, звязаныя з супраціўленнем ваеннапалонных, — будынак аўтамайстэрні, пад якую гітлераўцы выкарысталі армейскі клуб. Ваеннапалонныя, што там працавалі, здолелі арганізаваць уцёкі на бронемашынах, якія яны рамантавалі. У 1943 годзе так удалося выратавацца групе каля 10 чалавек. Упраўленне па ўвекавечанні памяці прадставіла план лагера, і ў кнізе ёсць фатаграфіі ацалелых аб'ектаў».

У выданні ўдзяляецца ўвага і іншым месцам масавага знішчэння ваеннапалонных. Дарэчы, адны з першых ахвяр былі знішчаны ў часовым лагеры побач з вёскай Дразды. Гітлераўцы расстралялі тут адабраных паводле «Загада аб камісарах» 10 тысяч найбольш «небяспечных» вайскоўцаў.

Масавая гібель ваеннапалонных, генацыд яўрэяў і іншыя расправы акупантаў падштурхоўвалі жыхароў Беларусі на барацьбу з нацыстамі. І яшчэ адна кніга, якую прэзентавала выдавецтва, якраз і расказвае пра гэта. У кнізе «Беларусь партызанская» ідзе гаворка пра рэйкавую вайну, сувязь з падпольшчыкамі і мірнымі жыхарамі і пра звычайнае жыццё партызанаў — у іх былі сталоўкі, лазарэты, школы, выдаваліся свае газеты і часопісы, асобныя партызанскія зоны дзейнічалі так, быццам савецкая ўлада адсюль нікуды і не сыходзіла. У кнізе змешчана каля 600 фатаграфій, многія з якіх раней не друкаваліся. Тэксты падрыхтавалі супрацоўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Трэба адзначыць і тое, што ўпершыню такое буйное грунтоўнае даследаванне выходзіць з перакладам на англійскую мову.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

КАНІКУЛЫ Ў СТЫЛІ «МІЛІТАРЫ»

Дваццаць тры вучні сярэдняй школы № 4 горада Рагачова правялі восем дзён у ліпені ў ваенна-спартыўным лагеры «Гвардзеец». Месціўся ён на базе 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады. Школьнікаў чакалі не толькі азы страявой падрыхтоўкі і ваенна-спартыўная эстафета, але і маштабная культурна-масавая праграма. Зрэшты, пра ўсё па парадку.

— Наш лагер, скіраваны на ваенна-патрыятычнае выхаванне падлеткаў, арганізуецца штогод, — кажа **намеснік камандзіра 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады па ідэалагічнай рабоце палкоўнік Сяргей КОРНЕЎ.** — Як правіла, сярэдні ўзрост дзяцей у нас — 11—13 гадоў. Мы знаёмім іх з тым, што такое Узброеныя Сілы, расказваем пра гістарычны шлях нашай брыгады, якая вызваляла 75 гадоў таму іх родны горад ад фашысцкіх захопнікаў.

Але толькі гэтым вайскоўцы не абмежаваліся. Вучняў чакалі ўрокі па выжыванні, якія абавязкова праходзяць разведчыкі. Навыкі гэтыя могуць спатрэбіцца і ў паўсядзённым жыцці. Напрыклад, заблукаць у лесе можа кожны. Як пры гэтым правільна сябе паводзіць, ведаюць, на жаль, не ўсе. Тут жа школьнікам расказвалі пра тое, як трэба ўладкоўваць укрыцце, дзе можна схавацца ад дажджу, паказвалі, як трэба распальваць вогнішча і гатаваць сабе ежу пасярод лесу. А заадно — і прыёмы самаабароны.

Школьнікі знаёміліся і з ваеннай тэхнікай, і з салдацкімі буднямі. Восем сутак яны жылі ў казарме. Адзінае — распарадак дня ў параўнанні з ваеннаслужачымі тэрміновай службы ў іх быў аблегчаны.

— Кожны юнак у будучыні — абаронца Радзімы, — працягвае Сяргей Корнеў. — Мы паказваем, што ў войску няма нічога страшнага. Тут служаць такія ж хлопцы, якія калісьці сядзелі за школьнай партай, як і гэтыя падлеткі. Гутарачы з вайскоўцамі, яны атрымліваюць усю неабходную інфармацыю, як гаварыцца, з першых вуснаў. І па досведзе мінулых гадоў, за 8 дзён дзеці цудоўна тут асвойваюцца. Праграма пабудавана так, каб яны з першага ж дня пачалі ўцягвацца ў распарадак дня. У бацькоў водгукі аб лагеры вельмі добрыя. І з кожным годам конкурс у лагер павялічваецца — жаданне дарослых адправіць дзяцей крыху больш чым на тыдзень да нас вельмі вялікае. Але мы імкнёмся трымаць колькасць вучняў у межах 20—30 чалавек. Гэта аптымальная колькасць для нас на сённяшні момант. Лічыце, як сярэдні клас.

Мы можам паказаць дзецям тут найбольш поўны спектр узбраення. У нас ёсць падраздзяленні разведвальныя, мотастралковыя, танкавыя, сувязь, артылерыя, інжынеры... Адпаведна, тэхніка і зброя разнапланавыя. І пабываўшы толькі ў нас, яны могуць атрымаць уяўленне аб розных родах войскаў. Даём першасныя навыкі і веды ў абыходжанні са стралковай зброяй, расказваем пра іх тактыка-тэхнічныя характарыстыкі, паказваем прыцэльныя прыстасаванні беларускіх распрацоўшчыкаў. Мы іх водзім на трэнажоры танкаў, баявых машын пяхоты. Яны выклікаюць найбольшую цікавасць. Фактычна перад імі — матэрыялізацыя камп'ютарнай гульні. А днём раней дзеці назіралі за тым, як ідзе пагрузка вайсковага эшалона. На платформы адпраўляліся танкі.

А яшчэ кожны дзень мы ладзім культурную праграму. Напрыклад, пабывалі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны. З'ездзілі ў Хатынь. Наведалі музей ваеннай гісторыі. Мы вельмі хочам, каб хлопцы, пабываўшы ў Мінску, вярнуліся ў Рагачоў з масай яркіх успамінаў. Ды ў такім узросце ўжо трэба падумваць і пра свой будучы прафесійны шлях.

У лагеры «Гвардзеец» таксама прайшла цікавая ваенна-спартыўная эстафета. Сёлета была павялічана дыстанцыя праходжання асобных элементаў паласы перашкод. Пасля гэтага школьнікі, як сапёры, шукалі пры дапамозе шчупа міну, вучымся накладваць шыны, аказваць медыцынскую дапамогу. А скончыў гэта прыгожы фініш.

А тым часам дамо слова непасрэдна ўдзельнікам лагера. **Андрэй Лапаткін** прыязджае сюды ўжо трэці раз.

— Даведаўся пра лагер вельмі проста — сказалі ў школе, што ёсць магчымасць паехаць. Тут мы, акрамя ўсяго іншага, кожны дзень гуляем у футбол. Салдаты рады нас бачыць. Шмат чаго новага я даведаўся аб вайсковай тэхніцы. Навучыўся адрозніваць вайскоўцаў па званнях. Дома ўсё роўна рабіць няма чаго, а тут усё так разнастайна і цікава... Навучыўся за гэты час маршыраваць і рана ўставаць.

Сяргей Лашкевіч, які перайшоў у восьмы клас, тут таксама трэці раз. Але выглядае хлопец кемлівым не па гадах. Ён сябруе са спортам. Раней займаўся плаваннем і мае другі разрад. Праўда, цяпер пераважае інтарэс да футбола.

— Дома ж нецікава. Смартфон, камп'ютар, канапа... усё адно і тое ж кожны дзень. А тут можна заняцца фізічнай падрыхтоўкай. Размінка ў нас, напрыклад, з самай раніцы. Праўда, у параўнанні з мінулымі гадамі мы цяпер устаём а 8-й гадзіне. Раней было а 7-й. Адбой у нас у 22 гадзіны. Але ў 21.55 мы ўжо павінны ляжаць па ложках.

Два сяржанты вучаць нас страявой падрыхтоўцы. Водзяць нас строем у сталовую есці. Праўда, адразу бачна, хто тут першы раз, а хто ўжо мае за плячыма пэўны досвед. Хоць, зрэшты, такія былі ўсе.

У жніўні плануецца правесці яшчэ дзве змены ў «Гвардзейцы». Гэтым разам — для мінскіх школьнікаў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Лізаветы ГРЫВАЧЭЎСКАЙ.

МЕДАЛЬ ТАКІ...

У ІМ ДВА БАКІ

Кажуць, жаночы ўзрост, як сукенка: не так важна, колькі ёй гадоў. Важна — правільна, з розумам насіць. Каб хто сказаў, як?
...У трамваі вось месца саступілі (мужчына, сімпатычны, у гадах...). Падумала (дурань думкай багацее), што гэта — як жанчыне і, шчаслівая, села. Потым падумала: «А раптам — як пажылой?» Тады лепш было б падзякаваць і адмовіцца... Ці пакрыўдзіцца...
А вось зараз што — уставаць?
...Уладзімір Даль — пісьменнік, этнограф, збіральнік фальклору — пісаў, што баба, пакуль з печы ляціць, сем дум перадумае.
Што цікава: мусіць, ніводная (з тых сямі) нават не «пастукае» ў галаву мужчыны.

ПЕРШАЕ ПРЫЗНАННЕ

Жыццё — тэатр. На «сцэне» (на заднім сядзенні тралейбуса) — двое: маці нешта чытае ў сваім смартфоне, дачка (гадоў чатырох)... спявае «Кацюшу»: старанна выводзіць мелодыю, ведае словы і «прамаўляе» іх іченька, шчыра — як для сябе.

А «публіка» між іншым таксама слухае (нейкі дачнік найбольш), пераглядаецца, усміхаецца і ў канцы — не апладзіруе, але ж букет мужчына падносіць.

— Гэта мне?! — пунсавее спявачка...

Запомніць бы вочкі яе і твар... Каб некалі потым, можа, пазнаць — на вялікай сцэне.

РОЗУМ ПРЫБУДЗЕ...

Сталіца ў «абдымках» сёл, прычым не простых, а так званых «царскіх», бо звычайных дамоў там амаль няма: спрэс — катэджы-асабнякі, на два паверхі, часам на тры...

А зрэшты, гэта «лезла» ў вочы раней. А цяпер — аб'явы: то на адным будынку, то на другім кідкае (каб здалёку відаць...) «Прадаецца...», «Прадаецца...», «Прадаецца...»

Трэба разумець, хто-ніхто ўжо нацешыўся, нажыўся на сотнях квадратаў (і найбольш удваіх), бо дзеці, як тыя птушкі, выраслі і паляцелі... Што крыўдна — не на нейкае там суседняе дрэва, — у іншы горад, а то і краіну...

Знаёмы архітэктар казаў, што «гняздо» будаваць трэба толькі для сабе.

СПРОБА НЕ ХВАРОБА

Нашы жанкі — зноў жа *наша* найбольшае дасягненне, бо яны і прыгажуні, і разумніцы, а ўжо майстрыхі... Пальцаў не хопіць, каб таленты злічыць: тая — шые і вяжа, тая — гатуе-пячэ, тая — гадуе сямёра дзяцей, малюе, фатаграфуе, лечыць...

Ігнатаўна (апроч іншага) — стрыжэ, з маладых гадоў: пачынала з бацькі і брата, потым з'явіліся муж, сын, зяць...

— Ты б яшчэ жаночыя стрыжкі асвоіла, — раім жанчыне, — у «іпэшніцы» пайшла, болей кліентаў займела... Глядзіш, нейкая капейка была б — прыварак да пенсіі.

— Куды ўжо мне... Позна, — адмахваецца прыяцелька, — не той узрост...

— Ну што ты такое кажаш? Які ў цябе ўзрост?! — наперабой пытаюць унучкі. — Паспрабуй, у цябе атрымаецца! Будзе свая цырульня...

А ў іх — адпаведна — тая «капейка».

ХТО, КАЛІ НЕ ТЫ?

На экранах тэлевізараў, на старонках газет гэткія гераіні не дзіва, а вось на вуліцы...

Ідзе вось — у бок прыпынку: адно, маленькае дзіцятка, нясе на левай руцэ (правай — коціць вазок), другое — гадкоў ад сілы двух — трымаецца за яе спадніцу, але тупае само, хлопчыкі-двайняты (ім, відаць, гадкі па тры ці чатыры) крочаць ззаду і пярэдні (гадоў сямі), як высвятляецца, таксама «адсюль» — з гэтай сямейкі!

Фота Сяргея БРУШКО.

Яна — вось такая — некуды едзе: заходзіць у трамвай. Найстарэйшы з сынкоў робіць гэты першым — «пракладвае» дарогу маці. Тая — за ручку — «падымае» на прыступку дзяўчынку, азіраецца, прыспешвае хлопчыкаў, пасля чаго з немаўлятам збіраецца зайсці сама...

Хацела падмагчы ёй — усцягнуць вазок і не паспела: апярэдзіў маладзенькі сяржант міліцыі. Прычым зрабіў гэта лёгенька, звычна, прыгожа...

Мо таму, што ў самога такое ж дзіця. Мо таму, што гадаваў некага з малодшых братоў ці сястрычак, а можа, бачыў калі дэвіз сваіх чэшскіх калег: «Дапамагаць і ахоўваць».

ШЧАСЦЕ ГЭТА...

Мы звалі яе Наймудрэйшай, што цалкам лагічна, бо год нараджэння — 1925-ы, сірата, працаўніца, пісьменніца, кандыдат навук, двойчы ўдава (першы муж загінуў у час вайны, а другі — памёр), бо столькі чытала і бачыла...

У тыя хвіліны і разам з намі — дыхтоўны дом на высокім пагорачку ды на беразе рэчкі...

— Шчаслівыя, — пазайздросцілі мы яго жыхарам. — Такая прыгажосць пад вокнамі!

— Але шчасце ж не ў ёй, — сказала пісьменніца.

— ?

— Шчасце ў тым, здаровы ты ці хворы, малады ці стары, з кім жывеш і на якія грошы, чым займаешся...

Што, вядома ж, чыстая праўда, бо дом узвесці (пры ўсёй складанасці) куды прасцей, а вось жыццё пабудаваць...

Што крыўдна, у большасці зодчых нават праектаў няма, хіба што лёгкія накіды.

КАБ ПОМНІЛІ...

Інфармацыі — вышэй даху: інтэрнэт, тэлебачанне, прэса і радыё, надпісы — у самых нечаканых месцах: на сценах дамоў, на адзенні і вопратцы, на сумках-пакетах, рэкламных шчытах, на целах маладых у выглядзе татуіровак, на машынах...

На адной — «Не прыціскайся, ты не ў пасцелі», на другой — «Жыву, як хачу, езджу, як умею», на трэцяй — «А каму цяпер лёгка?»

Зрэшты, надпісы як надпісы. І новага ў іх, здаецца, нічога, але помніць — трэба.

НАКАЗ

«Ты бачыш, як ён лычык задраў?! Нават не вітаецца», — пасмейваўся Якімавіч са свайго суседа, бо той нейкі час і сапраўды зямлі пад нагамі не бачыў — патрэбы не меў: з дому на службовай машыне забяруць, вечарам назад прывязуць. І кіроўца, якіх пашукаць: наперад забяжыць, дзверцу перад шэфам адкрые — усадзіць ці высадзіць, бо важная ж персона: без фігі не да носа, хоць...

Не задзірай
высока хвост,
Калі заняў высокі пост.
А лепш віляй сваім
хвастом,
Каб не расстацца з тым
пастом, —

казаў Якімавіч услед суседу. І шкада, што не ўголас: можа, пачуў бы?

МЕДАЛЬ ТАКІ...

...У краіне Гульні — Еўрапейскія, другія. «Панаехала гасцей з іншаземных абласцей...» Праўда, у вочы яны не вельмі кідаюцца, хіба недзе ў цэнтры ды ля пэўных аб'ектаў. А вось валанцёры... Іх вельмі шмат — хлопцаў і дзяўчат, маладых, прыгожых, у адмысловых касцюмчыках-красоўках, з рукзачкамі... І міліцыя пры парадзе — проста вачэй не адарваць: шэрыя адпрасаваныя нагавіцы, белыя кашулі... Гэта, што называецца, від спераду. Від ззаду — як водзіцца, зброя, дубінка...

Напэўна, так і павінна быць: да добрых людзей — добрым бокам, да дрэнных — благім.

Галоўнае, не пераблытаць адных з другімі.

ДВА ЎЗРОСТЫ...

Дзіна — позняя ўнучка: дзед яе ўжо і не чакаў... Потым марыў хоць бы ў садок завесці. Але ж бог яму паспрыяў — павадзіў у школу, са школы і не раз сваё важкае слова сказаў...

Перад выпускным дзяўчо заявіла: мам-тата, маўляў, мы здаём бабуліну кватэру, каб сабраць мне грошы на вучобу. Калі я паступлю на бюджэт, можна буду жыць самастойна, адна — у той кватэры?

Бацькам тады мову адняло, бо ніякіх жа канфліктаў, у доме чысціня, парадак, у дачкі асобны пакой. Дык якога, з дазволу, ражна...

— Ты не паступіш, — першай «ачуняла» маці.

— А давай! — гэта бацька «пайшоў у заклад». — Я ключы адразу аддам.

Паабяцаў, карацей, а калі дачка паступіла, раптам спалохаўся: стаў выпытваць, што ёй не падабаецца дома, як яна будзе адна і навошта... Стаў хвалявацца, што з некім звяжацца...

Вось тады і ўмяшаўся дзед. Сказаў:

— Ціха, сын. Дамова была? Была. Ты ключы абяцаў? То давай. Дарослае дзіця. Хоча жыць самастойна, як я, то няхай паспрабуе.

Дзіна з тога часу жыве. І да дзеда зрэдчас наязджае: прыбірае ў кватэры, нешта гатуе, гутаркі вядзе.

— Ты з чаго пачынаеш свой дзень? — спытала неяк за чаем.

— Ну, памаленьку ўстаю — гадзін у 10—12, бо вельмі позна лажуся, тэлевізар гляджу, — расказваў дзядуля. — Потым паўзу ў ванну мыцца-галіцца. Пасля гэтага можна і на кухню. Вару там кашу і адно яечка ўсмятку... А ты?

— Я? Падскокваю ў сем. Хвілін дзесяць — на мыццё і зарадку... Над кашай стаяць мне часу няма. Шматкі хіба кіпнем залью. А вось яйкі люблю: дзесяць штук вару ў панядзелак. Восем кладу ў халадзільнік, два пакідаю ў каструлі.

— Гэта яшчэ навошта? — не разумее дзядуля.

— Ну, дзесяць — каб заўтра-паслязаўтра не варыць, а два — каб хутчэй пачысціць і з'есці.

...Два ўзросты — два рытмы жыцця.

А кроў — адна.

НА ЎСПАМІН...

Лідка — добрая душа: падарункі — а тым больш з Парыжа — прывезла б усім! Але ж грошы... Ды і чамадан не гумовенькі — шмат не пакладзеш, а пакладзеш — ці падымеш...

Перад самым адлётам пашчасціла: пры гасцініцы, у маленькай гаспадарчай крамцы, убачыла фартушкі — яркія, недарагія, з нейкага танюткага нейлону...

Узяла спачатку пяць, потым — яшчэ пяць, скруціла ў трубачку, прывезла — шмат каго ашчаслівіла...

Адзін вось дома вісіць — гадоў з трыццаць ужо... Не запляміўся, не аблез, не парваўся — служыць, як новенькі!

І тым самым шораз нагадвае пра нябожчыцу Лідку, якая так хацела прывезці падарункі ўсім.

ХІМІЯ ГЭТА...

Кажуць, французанкі ходзяць у цырульню, каб адпачыць. Многія беларускі цяпер таксама, бо чэргаў ніякіх: салонаў — і дзяржаўных, і прыватных — шмат. А ўжо там знайшоў свайго майстра, у крэсла сеў і можаш расслабіцца — ні аб чым не думаць, пакуль...

Чуваць і ў люстэрка відаць, як дзверы за спінай адчыняюцца — у цырульню заходзіць жанчына (маладая, танюткая, у парычку), пытае, ці можна будзе пастрыгчыся? Адміністратарка ветліва прабачаецца, спрабуе сказаць, што лепей было запісацца — на пэўны час...

Жанчына чуе, відаць, толькі гэта, апошняе слова і ў адказ пачынае даводзіць, што якраз часу на яе і не трэба — стрыгчы няма чаго, хіба так, крыху падраўняць, бо галава была, як калена: валасы пасля хіміі вылезлі, а цяпер вось сталі адрастаць.

— Хто ж вам рабіў тую хімію? — пытае адміністратар. — Гэта ж падсудная справа...

— Вам я не пра завіўку, — усміхаецца «пацярпелая». — Анкалогія ў мяне... Хімітэрапія...

Французанкі ў цырульні, можа, і праўда, ходзяць, каб адпачыць: у іх слова «хімія» мо і не мае столькі значэнняў?

ЧАЛАВЕК — ГЭТА ГУЧЫЦЬ...

Штодзённа: зайсці ў аўтобус, калі пашчасціць, — сесці, паставіць на калені сумачку, палажыць пальчаткі, разгарнуць кнігу і зачытацца, бывае, так, што потым птушкай імкнеш на выхад, вылятаеш на вуліцу і ўжо там, гледзячы ўслед трамваю, разумееш, што пальчаткі... паехалі далей.

Гэта — згуба восені, зімы ці вясны. Летам — іншая.

...У той раз знаёмец на машыне падвозіў (кніга-сумка-парасон — на каленях). За шумным скрыжаваннем спыніўся. Мы выскачылі (бо трэба ж хутчэй), нават крыху адышлі — азірнуліся ўслед машыне і на месцы, адкуль яна з'ехала, убачылі свой парасон, які толькі што зваліўся з каленяў. Што цікава — пры сведцы: побач стаяў мужчына, усё бачыў і не аклікнуў, не сказаў...

Каб потым, трохі счакаўшы, тую згубу падняць-прысабечыць?..

...Не хацелася б думаць пра чалавека дрэнна, але ж і добра часам не выпадае.

Валянціна ДОЎНАР.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Небяспечная інфекцыя

«ВЫЛЕЧЫМ УСІХ!»

Як у Беларусі змагаюцца з гепатытам С

У больш як 33 тысяч беларусаў выяўлены вірус гепатыту С. Штогод гэта ліч-ба павялічваецца ў нас на тры тысячы. Небяспечную інфекцыю называюць «маўклівым забойцам», бо яна можа доўгі час ніяк сябе не праяўляць, прывo-дзячы да цырозу печані. Заразіцца можна падчас пералівання крыві, хірургічных і стаматалагічных маніпуляцый, выкарыстання шматразовых шпрыцаў і нават у манікюрных і тату-салонах. Ва ўсім свеце гэты вірус мае каля 25 мільёнаў чалавек і каля 1,4 мільёна штогод ад яго памірае. Паводле статыстыкі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, 9 з 10 чалавек, якія з'яўляюцца носьбітамі небяспечна віруса, не ведаюць пра гэта.

— Да 90 % хворых на гепатыт С — людзі працаздольнага ўзросту, у сярэднім ім 30—40 гадоў, — адзначае **галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ірына ЛОБАХ.** — За апошнія 13—15 гадоў захваральнасць вострай формай знізілася амаль удвая і тэндэнцыя да змяншэння будзе працягвацца. З 2016 года ў Беларусі зарэгістраваны супрацьвірусныя лекавыя сродкі прамога дзеяння, а з 2017 года працуе праграма сістэмнага лячэння. Яна дазваляе штогод пралечваць ад 4 да 6 тысяч хворых за сродкі рэспубліканскага бюджэту. Поспехі ў барацьбе з гепатытам звязаны і з тым, што айчынная фармацэўтычная прамысловасць выраблае прэпараты супраць гепатыту, дзякуючы чаму лячэнне стала больш даступным.

Як перадаецца гепатыт С і хто ў групе рызыкі?

Для Беларусі характэрны ў асноўным парэнтэральны шлях перадачы віруса — праз заражаную кроў і іншыя біялагічныя вадкасці.

— Гэта можа быць звязана з аказаннем медыцынскай дапамогі, пераліваннем крыві, увядзеннем ін'екцыйных наркотыкаў, акрамя гэтага, вірус можа перадавацца палавым шляхам і ад маці да дзіцяці падчас родаў. Сустракаюцца выпадкі перадачы падчас манікюру і тату, — пералічвае **загадчык кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ, галоўны пазаштатны спецыяліст па інфекцыйных хваробах Міністэрства аховы здароўя Ігар КАРПАЎ.**

Каму трэба абследавацца?

Паколькі найчасцей хвароба ніяк сябе не праяўляе, даведацца пра наяўнасць віруса ў арганізме можна толькі здаўшы спецыяльныя аналізы. Але ці кожнаму трэба абследавацца?

— Абследаваць абсалютна ўсіх на вірус гепатыту С няправільна. Мы накіроўваем на аналіз пэўныя групы, у прыватнасці, медыцынскіх работнікаў, якія кантактуюць з крывёй, ваеннаслужачых, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, цяжарных жанчын, людзей, якія хварэюць на ВІЧ-інфекцыю і туберкулёз, знаходзяцца на гемадыялізе, — расказвае Ігар Карпаў. — Здаць аналіз сёння можна ў любой амбулаторыі. У пацыента павінен быць выбар — калі ён жадае абследавацца, можа гэта зрабіць платна.

Ці ёсць прышчэпка ад гепатыту?

Прышчэпак ад самага небяспечнага віру-су — гепатыту С — не існуе. А вось вакцынацыя ад гепатыту В з'яўляецца абавязковай і ўваходзіць у Нацыянальны прышчэпачны каляндар.

— Дзякуючы прышчэпкам, захваральнасць на гепатыт В знізілася больш чым у 20 разоў у параўнанні з пачаткам 2000-х, — падкрэсліў Ігар Карпаў. — З гэтага перыяду, дарэчы, прынцыпова знізілася і захваральнасць на гепатыт А.

Як лечаць гепатыт С?

Яшчэ некалькі гадоў таму поўны курс лячэння ад гепатыту С каштаваў дзясяткі



тысяч долараў. Сёння яго лечаць за сродкі бюджэту, а цана прэпаратаў, якія пачалі выпускаць айчынныя фармпрадпрыемствы, істотна знізілася. Зараз курс лячэння каштуе каля 1 800 рублёў.

— У 2017 годзе паступілі першыя бясплатныя лекі ад нашых грузінскіх калег, якія дазволілі паспяхова пралячыць 419 пацыентаў. Пасля гэтага лячэнне ажыццяўлялася за кошт цэнтралізаваных закупак Міністэрства аховы здароўя. Было набыта дзве тысячы 12-тыднёвых схем супрацьвіруснага лячэння, — расказвае **намеснік галоўнага ўрача Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Мінска, галоўны пазаштатны спецыяліст па аказанні медыцынскай дапамогі пацыентам з ВІЧ-інфекцыяй Міністэрства аховы здароўя Алег СКРЫПКО.** — На гэты курс бралі не ўсіх: толькі пацыентаў з вострай патрэбай, якія мелі працяглыя стадыі фіброзаў печані і непячоначныя праявы гепатыту. Цяпер мы перайшлі да лячэння ўсіх хворых. Апошняя партыя лекаў складалася з 6 тысяч курсаў, якімі пралячылі 4,5 тысячы пацыентаў. Зараз плануем закупляць наступную партыю на 6 тысяч курсаў. Да гэтага часу будуць падрыхтаваны пацыенты.

Каб трапіць у праграму лячэння гепатыту С, хвораму дастаткова звярнуцца да інфекцыяніста. Спецыялісты сцвярджаюць, што тэрапію атрымаюць усе пацыенты і чэргаў не будзе. І дадаюць: мы вылечым усіх. Эфектыўнасць лячэння набліжаецца да 100 %.

— З першым генатыпам гепатыту С вылечваецца 96 % пацыентаў, з другім — 100 %, з трэцім — 94,1 %, — паведаміў Алег Скрыпко.

Не сакрэт, што гепатыт С распаўсюджаны сярод людзей, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. На яго хварэе некалькі тысяч зняволеных. Сёння гэтыя людзі атрымліваюць лячэнне ад ВІЧ і туберкулёзу. У найбліжэйшы час яны будуць лячыцца і ад гепатыту С.

Пазбавіцца ад хваробы да 2028 года

Беларусь узяла на сябе абавязацельствы пазбавіцца ад гепатыту С да 2028 года.

— Глабальная стратэгія прадугледжвае ліквідаваць вірусны гепатыт С ва ўсім свеце да 2030 года. І мы апладзіруем Беларусі за тое, што яна ўзяла на сябе абавязацельствы справіцца з гэтай хваробай да 2028 года, — заявіла **кіраўнік аддзела ВІЧ і вірусных гепатытаў Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Ніколь СЕГІ.** — Для гэтага ў вас павінна быць дакладная скрынінгавая стратэгія. Неабходна працаваць з людзьмі, якія ўжываюць ін'екцыйныя наркотыкі, дэкрымінаізаваць гэтую хваробу, каб людзі звярталіся па медыцынскую дапамогу.

❍ ЯК У СУСЕДЗЯЎ?

Грузія стала той краінай, на якой адпрацоўвалася мадэль лячэння і элімінацыі (выключэння) гепатыту С. Яшчэ некалькі гадоў таму яна займала трэцяе месца ў свеце па распаўсюджанасці інфекцыі. На сёння там абследавана больш за два мільёны жыхароў. Паводле ацэначных даных, інфекцыю мае каля 150 тысяч жыхароў. У праграме лячэння на сёння больш за 58 тысяч пацыентаў, 53 тысячы з іх ужо паспяхова скончылі лячэнне. Да 2021 года Грузія плануе ліквідаваць гепатыт С.

Не згарэць на рабоце пасля адпачынку

Ніхто так не мае патрэбы ў водпуску, як чалавек, які... толькі што вярнуўся з водпуску. Знаёма? Гэтаму сцвярджэнню амерыканскага пісьменніка Элберта Грына Хабарда, між іншым, больш за стагоддзе, але і сёння яно не страціла актуальнасці. Вучоныя правялі даследаванні і высветлілі, што 50 % людзей пры выхадзе на работу пасля працяглага водпуску перажываюць праблемы са здароўем. Здавалася б, адпачыўшы, мы павінны з падвоенай энергіяй узяцца за справы, якія назапасіліся за час нашай адсутнасці. Аднак дзе там! Замест гэтага многія пачынаюць хандрыць і ўпадаюць у дэпрэсію. Чаму ўзнікае постводпускны сіндром, як мінімізаваць гэты стрэс і дапамагчы арганізму настроіцца на працоўны распарадак, расказала ўрач-псіхатэрапеўт Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля ГУРАВА.

— У водпуску ў нас быў зусім іншы рэжым. А цяпер трэба рана прачынацца і недасыпаць. Мы ўсведамляем, што напарадзе нас чакае не адпачынак з яго станоўчымі эмоцыямі, а працоўныя будні і неабходнасць вырашаць няпростыя задачы. Такі фізічны і душэўны стан атрымаў назву «постводпускны сіндром», — расказвае Наталля Георгіеўна. — Выяўленасць яго праяўляецца ў псіхалагічных рытмы жыцця — харчаванне, працягласць сну, разумовыя і фізічныя нагрузкі, эмацыянальны фон. Часта на час водпуску мы мяняем часавыя і кліматычныя паясы. Таму лагічна, што многім людзям не пад сілу імгненнае пераключэнне на працоўны лад, а працэс адаптацыі займае пэўны час. І сітуацыя ўскладняецца ўсведамленнем таго, што наступны адпачынак будзе не хутка, і нас чакае працяглы час работы.

— Чаму ўзнікае постводпускны сіндром?

— Як ні дзіўна, але адпачынак у водпуску — гэта таксама стрэс для нашага арганізма. І гэты стрэс тым мацнейшы, чым далей мы з'язджаем ад нашага звыклага месца пражывання. Падчас адпачынку наш арганізм расслабляецца. Адпачываючы, мы мяняем свае звыклыя біялагічны і псіхалагічны рытмы жыцця — харчаванне, працягласць сну, разумовыя і фізічныя нагрузкі, эмацыянальны фон. Часта на час водпуску мы мяняем часавыя і кліматычныя паясы. Таму лагічна, што многім людзям не пад сілу імгненнае пераключэнне на працоўны лад, а працэс адаптацыі займае пэўны час. І сітуацыя ўскладняецца ўсведамленнем таго, што наступны адпачынак будзе не хутка, і нас чакае працяглы час работы.

Карысна ўключыць у свой рацыён прадукты, якія павышаюць гармон радасці ў крыві — памідоры, бананы, авакада, нятлустую рыбу і морапрадукты, ліставую салату, рукалу і іншую зеляніну, сыр.

— Постводпускны сіндром мае свае характэрныя сімптомы?

— Да іх можна аднесці сум, раздражнёнасць, меланхолію, пастаяннае пачуццё трывогі, стомленасць, боль у мышцах, галаўны боль, рэзкія перапады настрою, зніжэнне працаздольнасці, пачуццё, што нават простыя задачы невырашальныя.

— Дык можа, тады лепш увогуле не адпачываць — у прыватнасці, тым, хто так цяжка вяртаецца ў рабочы рэжым?

— На рабоце мы часта забываем пра сябе, пра свае жаданні, а ў адпачынку стараемся папесціць сябе любімага. Зразумела, вельмі не хочацца зноў успамінаць пра свае працоўныя абавязкі. Як правіла, на рабоце падчас адсутнасці супрацоўніка нічога не змянілася. А вось сам чалавек мяняецца, як і яго адчуванні, вось і атрымліваецца крызісная сітуацыя. Але зусім не адпачываць небяспечна як для псіхічнага, так і для фізічнага здароўя. Працуючы без водпуску, можна выгараць, стаць раздражнёным і агрэсіўным. І вярнуцца потым у нармальны стан дастаткова складана, таму браць водпуск і адпачываць трэба кожны год.

— Які перыяд патрэбны, каб адаптавацца пасля адпачынку?

— Каб вярнуцца ў звыклы фізіялагічны стан пасля водпуску, патрабуецца, як правіла, каля двух тыдняў. Псіхалагічная адаптацыя доўжыцца да 40 дзён.

— Як мінімізаваць стрэс у пераходны перыяд і настроіцца на рабочы рэжым?

— Пастарайцеся вярнуцца дадому з адпачынку ці канікул на два-тры дні раней, каб спакойна вярнуцца да звыклага рэжыму. Пасля выхаду на работу імкніцеся хоць бы на працягу 10 дзён высыпацца, каб арганізм без стрэсу змог вярнуцца ў звыклае рэчышча. Пацікаўцеся, як справы ў калектыве, чым займаліся калегі, над чым працавалі, і пачынайце займацца якімі-небудзь дробнымі справамі, паступова нарошчваючы аб'ём. Абавязкова складзіце план дзеянняў хоць бы на найбліжэйшы час. Паступова пераходзьце да вырашэння больш складаных задач.

Увогуле важна не зацягваць водпуск. За гэтым можа прыйсці эмацыянальны крызіс і глыбокая дэпрэсія. І тут ужо, каб пазбавіцца ад апатыі, маркоты, дрэннага настрою, аднавіць цікавасць да таго, што адбывацца, патрэбны спецыяліст. Хандру можна перамагчы бытавой актыўнасцю, здаровым харчаванням, фізічнымі нагрузкамі, прыёмам вітамінаў. Увогуле ранішняя зарадка, плаванне, бег, веласіпед выдатна спраўляюцца са стрэсам. Карысна ўключыць у свой рацыён прадукты, якія павышаюць гармон радасці ў крыві — памідоры, бананы, авакада, нятлустую рыбу і морапрадукты, ліставую салату, рукалу і іншую зеляніну, сыр.

Важна не імкнуцца адразу вярнуцца ў даадпускны рэжым актыўнасці і нагрузак. Гэта датычыцца не толькі работы, але і баўлення вольнага часу. З водпускам трэба развітвацца плаўна, факусуючы ўвагу толькі на прыемных успамінах. Падзяліцеся імі з блізкімі і сябрамі, пакажыце ім свае відэа- і фотаздымкі, пачастуйце смачнымі напоямі і закускамі, якія прывезлі з водпуску. Дзелячыся станоўчымі эмоцыямі, мы наноў іх перажываем.

Калі ж выхад на работу абарочваецца для вас катастрофай, магчыма, трэба задумацца аб неадпаведнасці яе вашаму прызванню ды змяніць месца і нават сферу дзейнасці. Калі ж праца ў радасць, і патрабуецца толькі асвяжыць заціканасць, тады дастаткова ўсяго толькі сфармуляваць мэты і прыступіць да іх ажыццяўлення.

СЮРПРЫЗЫ НАДВОР'Я

ПРАГНОЗ — СПРАВА ШМАТФАКТАРНАЯ

Каб зрабіць дакладны прагноз надвор'я, спецыялісты павінны ўлічваць вялікі набор умоў. Так, сіноптыкі Белгідрамета ў кругласутачным рэжыме аналізуюць, як змяняюцца розныя характарыстыкі атмасферы, развіваюцца атмасферныя працэсы, а таксама фактары, якія ўплываюць на надвор'е. Сярод такіх фактараў тэмпература паветра, атмасферны ціск, вільготнасць, хуткасць і напрамак ветру, перанос паветраных мас з сумежных тэрыторый, іх стан, траекторыя і хуткасць перасоўвання, асаблівасці мясцовага рэльефу, наяўнасць буйных вадаёмаў, лясістасць тэрыторыі, уплыў буйных прамысловых цэнтраў.

Усе гэтыя даныя выкарыстоўваюцца для падрыхтоўкі розных відаў прагнозаў — як агульнага карыстання, так і спецыялізаваных. Прагнозы надвор'я агульнага карыстання не маюць вызначанай спецыфікі, прызначаны для забеспячэння органаў улады, узброеных сіл, міністэрстваў і насельніцтва. Спецыялізаваныя ж прагнозы складаюцца для асобных галін народнай гаспадаркі (грамадзянскай авіяцыі, сельскай гаспадаркі, чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту і да т. п.) з улікам спецыфікі іх дзейнасці.

Нягледзячы на адрозненні, найбольш важным і адчувальным і для жыхароў краіны, і для галін эканомікі з'яўляецца дакладнасць прагнозаў выпадзення ападкаў.

НА ЎЗВЫШШАХ ЛЬЕ, У НІЗІНАХ СУШЫЦЬ?

— Тэрыторыя нашай краіны размешчана ў зоне дастатковага ўвільгатнення, — расказвае **начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыяцыйнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Раман ЛАБАЗНАЎ.** — Геаграфічнае становішча Беларусі абумоўлівае характэрнае для ўмераных шырот паўночнага паўшар'я актыўнае развіццё цыкланічных працэсаў і пераважны заходні перанос вільготных паветраных мас з Атлантыкі. У год у сярэднім па краіне выпадае 650 мм ападкаў. Інакш кажучы, за год на адзін квадратны метр паверхні выліваецца 650 літраў вады. Пры гэтым 54 % (350 мм) з гадавой колькасці ападкаў прыходзіцца на пяць цёплых месяцаў — з мая да верасня. Але ападкі па тэрыторыі краіны распаўсюджваюцца нераўнамерна.

Так, найбольш часта дажджы выпадаюць на заходніх ускраінах узвышшаў, якія ляжаць на шляху пераважнага заходняга пераносу паветраных мас. 380 мм ападкаў і больш адзначаецца ў раёне Навагрудскага ўзвышша і Свянцянскай грады, а таксама паблізу метэастанцыі «Жыткавічы». У апошнім выпадку максімумы па колькасці ападкаў звязаныя з высокім мясцовым выпарэннем з абводненых тэрыторый (азёраў, балот), а таксама вялікай лясістасцю мясцовасці — гэта спрыяе дадатковаму развіццю воблачнасці і, як следства, выпадзенню большай колькасці ападкаў.

Мінімум жа ападкаў (320 мм і менш) назіраецца на тэрыторыі Прыдняпроўскай нізіны. Тут, як і ў цэлым ва Усходняй Еўропе, адзначаецца агульная тэндэнцыя да памяншэння ападкаў у паўднёва-ўсходнім напрамку. На астатняй тэрыторыі рэжым увільгатнення блізкі да нормы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІВЕНЬ... З-ЗА МЯЖЫ

Па ўмовах утварэння спецыялісты падзяляюць ападкі на два тыпы: франтальныя, якія ўтвараюцца пры праходжанні атмасферных франтоў, і ўнутрымасавыя — пры развіцці аднайменнай воблачнасці ў выніку інтэнсіўнага нагрэву зямной паверхні.

— Выпадзенне экстрэмальнай колькасці ападкаў летам часцей за ўсё звязана з праходжаннем актыўных франтоў паўднёвых цыклонаў, — кажа Раман Лабазнаў. — Моцныя лакальныя ліўневыя дажджы здараюцца, калі да нас з Чорнага ці Міжземнага мораў паступаюць гарачыя трапічныя паветраныя масы з магутнай кучава-дажджавой воблачнасцю.

Ападкі, якія ўтвараюцца ва ўнутрымасавай воблачнасці, маюць пераважна ліўневы характар. У асобных выпадках яны дасягаюць крытэрыю небяспечных з'яў (моцны ліўень — з колькасцю ападкаў 30 мм за гадзіну, вельмі моцны дождж — 50 мм не больш чым за 12 гадзін), выпадаюць раптам (жыццёвы цыкл навальнічнага воблака, як правіла, не перавышае трох гадзін). Такія ападкі прывязаны галоўным чынам да ўзвышшаў (Навагрудская, Мінская, Аршанская, Віцебская, Гарадоцкая, Свянцянская грады) і да тэрыторый з высокай лясістасцю і забалочанасцю (Палеская і Полацкая нізіны). Пры гэтым з-за невялікага дыяметра ўнутрымасавай воблачнасці і лакальнага ўтварэння яны выпадаюць ачагамі.

СПЁКА З ПОЎДНЯ — ЧАКАЙ КАТАКЛІЗМАЎ

Нягледзячы на агульную тэндэнцыю павелічэння ападкаў па тэрыторыі Беларусі, за апошнія пяць гадоў (2014—2018 гады) у цёплы перыяд года спецыялісты адзначаюць іх памяншэнне ў сярэднім па краіне на 10 % — з мая да верасня колькасць ападкаў па краіне склала 320 мм, ці 90,5 % нормы. Асабліва моцна працэс закрануў Гомельскую вобласць, дзе за гэты перыяд выпала толькі 86,5 % нормы.

— Пры гэтым на фоне памяншэння ападкаў працягвае расці тэмпература паветра, — адзначае Раман Лабазнаў. — За пяць гадоў у цёплы перыяд года яна была вышэй за норму на 1,2 °С. Спалучэнне названых умоў прывяло да таго, што ў апошняе пяцігоддзе штогод узнікаюць засухі.

Прычыны сітуацыі спецыялісты звязваюць з паслабленнем заходняга пераносу і ўзмацненнем паступлення на тэрыторыю Беларусі гарачага паветра трапічнага паходжання з паўднёвага захаду Еўропы, што адбывалася і сёлета. У маі і чэрвені замест звычайнага заходняга пераносу паветраных мас з Атлантыкі на тэрыторыю нашай краіны паступала вельмі цёплае паветра з поўдня Еўропы, якое ўтрымлівала вельмі мала вільгаці. У выніку пераважала вельмі гарачае надвор'е з пераважным выпадзеннем унутрымасавых ападкаў.

— Сярэдняя тэмпература паветра ў маі была на 1,0—1,5 °С вышэй за норму, а чэрвень аказаўся на 4—5 °С вышэй у параўнанні з нормай за апошнія 75 гадоў, — тлумачыць спецыяліст. — На фоне цёплага мая і гарачага чэрвеня вылучаецца першая палова ліпеня з сярэднясутачнымі тэмпературамі паветра на 2—3 °С ніжэй за норму. І толькі днём 1 ліпеня была адзначана самая высокая тэмпература паветра ў гэтым годзе — +36,4 °С на станцыі Брагін.

За май — першую палову ліпеня найбольшая колькасць ападкаў — 200 мм і больш (1—1,5 нормы за гэты перыяд) — адзначана па паўднёвым захадзе і паўночным усходзе краіны (Брэсцкая і Віцебская вобласці). На астатняй тэрыторыі адзначалася норма ці нават менш нормы ападкаў. Найменш увільготненай (80 % нормы і менш) аказалася большая частка Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей. Самы вялікі недабор ападкаў быў у чэрвені, калі ў сярэднім па краіне выпала 55 % месячнай нормы.

ДАРОЖНАЯ КАРТА ДЛЯ СІНОПТЫКАЎ

— У пачатку лета 2019 года ў Беларусі склалася не характэрная для нашай краіны сінаптычная сітуацыя — вельмі гарачае надвор'е з дэфіцытам ападкаў, — кажа **кліматолаг, акадэмік НАН Беларусі Уладзімір ЛОГІНАЎ.** — Такія працэсы складана спрагназаваць з-за магутнага выпадковага складніка. Працэс фарміравання ападкаў праходзіў пры вельмі высокіх тэмпературах. Для такой сінаптычнай сітуацыі лакальныя ліўневыя дажджы нават над раўніннымі тэрыторыямі выпадаюць вельмі нераўнамерна, што значна ўскладняе прагназаванне — дзе выпадуць ападкі і ў якой колькасці.

У год у сярэднім па краіне выпадае 650 мм ападкаў. Інакш кажучы, за год на адзін квадратны метр паверхні выліваецца 650 літраў вады.

Па словах кліматолага, у такой сітуацыі для сіноптыка важна карыстацца данымі метэаралагічных радыёлакатараў і спадарожнікавымі здымкамі, якія ў рэжыме рэальнага часу дазваляюць адсочваць сінаптычную сітуацыю і прымаць рашэнні аб распрацоўцы штармавых папярэджванняў.

Каб прагноз такіх нехарактэрных для краіны сінаптычных працэсаў станавіўся больш дакладным, неабходна пастаянна ўдасканальваць навукова-тэхнічную базу Белгідрамета, упэўнены спецыяліст.

Начальнік упраўлення ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змены клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталля АЛЕЙНІКАВА расказала, што Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя зацверджаны план мерапрыемстваў («дарожная карта») па ўдасканаленні прагназавання надвор'я на кароткатэрміновую і сярэднетэрміновую перспектывы на 2018—2020 гады. У адпаведнасці з ім прадугледжана пашырэнне сеткі назіранняў Белгідрамета да 61 аўтаматычнай метэаралагічнай станцыі (на пачатак ліпеня іх дзейнічала 53 са ступенню аўтаматызацыі 81 %), будаўніцтва і ўвод у эксплуатацыю метэаралагічных радыёлакатараў у аэрапортах Віцебска, Гродна і Брэста, а таксама мадэрнізацыя сістэм перадачы і апрацоўкі інфармацыі.

Павелічэнне колькасці пунктаў назіранняў за кошт устаноўкі аўтаматычных станцый дазволіць сачыць за зменай умоў надвор'я практычна ў рэжыме рэальнага часу. Плануецца таксама стварыць адзінае поле радыёлакацыйных назіранняў для ўсёй тэрыторыі Беларусі з уключэннем даных назіранняў на тэрыторыях сумежных дзяржаў.

— Неабходна таксама ўмацоўваць навуковы патэнцыял гідраметэаралагічнай галіны, — упэўнены Раман Лабазнаў. — Гэта ў выніку дапаможа стварэнню больш дасканалых прагнастычных мадэляў — з улікам тыпу атмасфернай цыркуляцыі, сезона года і падсцілаючай паверхні. Вельмі важна ўлічваць і замежны досвед прадстаўлення прагнастычнай інфармацыі спажыўцу і эфектыўнага выкарыстання гэтых даных пры вядзенні паўсядзённай гаспадарчай дзейнасці.

Вераніка КОЛАСАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Безліч сцежак было ў жыцці,
Але ў памяці, нібы сёння,
Бачу тую, ў зялёным сутонні,
Дзе мне вызначыў лёс ісці.

Я вяртаюся зноў шукаць
След пакінуты
ў росных травах,
Ды пад шатамі
новай дубравы
Даўніх сцежак ужо не відаць.

Але з далечы, праз гады
Прыляцела у засень
дажджынка —
Мо раскажа,
дзе тая сцяжынка
Прыхавалася назаўжды.

ЧАМУ Ў ЛЕСЕ ВОЎК ЗДОХ...

Калі Міколу Сяргеевічу трэба было сустрэцца са сваім сябрам Астапчуком ці нешта ўдакладніць у яго, ён абавязкова вырашаў гэтае пытанне з дапамогай тэлефона. Той жа раз заўсёды надзейная сувязь чамусь «баставала», а мабільнік цэлых паўтары гадзіны тлуміў адно і тое ж: «абанент часова недаступны». З прычыны таго, што справа ў Хутарнога была неадкладная і да таго ж яшчэ, што ён на сваёй легкавушцы якраз праязджаў міма дома, дзе жыў Алег Антонавіч, то і вырашыў заскочыць да яго на пяты паверх. Дзверы адчыніў сам гаспадар, які растлумачыў, што два дні таму змяніўся нумар гарадскога тэлефона, а мабільнік ён адключыў сам, каб управіцца з работай.

— З якой яшчэ работай? — спрабаваў высветліць у яго Мікола Сяргеевіч. — Сёння ж выхадны...

— Для цябе, можа, і выхадны, а для нас нечакана рабочы. Лепш зірні сюды...

Тое, што ўбачыў Хутарны, выклікала ў яго пытанне:

— Гэта што: у лесе воўк здох? Вы — грыбнікамі сталі? Не веру...

Здзіўлянцца сапраўды было чаму. У прасторнай зале на разасланай на падлозе цэлафанавай плёнцы ўперамешку з сасновым шыгаллем і пажаўцелым лісцем бярэзніку і асінніку выслалася груда маслякоў, апенек, махавікоў, а на другой — ужо ачышчаных іх. Каля тых груд са сцізорыкамі ў руках сядзелі жонка Астапчука Яўгенія Максімаўна і яе бацька Максім Яфімавіч. Побач стаяла табурэтка, вядома ж, для Алега Антонавіча.

— Задзяўблі ўжо мяне гэтыя маслякі-слізнякі, — буркатой адклікнулася на пытанне Хутарнога Яўгенія Максімаўна. — Лепш бы я тыя дваццаць еўра ўзяла і на іх вам на рынку тых грыбоў гатовенькіх накупіла, чым зараз петацца.

Апошнія яе словы выклікалі ў Міколы Сяргеевіча яшчэ большую цікавасць, і ён папрасіў свайго сябра, як гаворыцца, не цягнуць ката за хвост і расказаць, што да чаго.

Аказваецца, Астапчукі ў той выхадны дзень пасля наведвання ў Рэчыцы радні Алега Антонавіча вярталіся ў Гомель і спыніліся ў лесе для адпачынку. І сваю «таёту» паставілі на палянцы недалёка ад «мерседэса», каля якога ляжала нейкая прасціна. Самі ж накіраваліся ў малады сасняк. Там на карачках некалькі чалавек збіралі грыбы. Астапчукі не заўважылі, што і самі так нечакана захапіліся «ціхім паляваннем», што адышлі ад тачкі месца і натрапілі на ладную сямейку апенек. Далей — болей: напароліся на чатыры прыгажуны-баравікі. Ахвота была б пахадзіць па лесе яшчэ, ды трэба было ехаць дадому.

І вось да іхняй легкавушкі падыходзяць гадоў пад пяцьдзясят мужчына ды жанчына і пытаюць, ці не сустракаўся ім дзядок. Яму, глухавацаму, які нядаўна выпісаўся з бальніцы, было загадана не адыходзіць ад «мерседэса» і адпачываць на той прасціне, а ён некуды знік. Пэўна, заблукаў, а хутка ж вечар. Бачылі аднаго старога, быў адказ Астапчукоў. Дык Богам просім: пакажыце дзе. Ну як было адмовіць людзям у такой сітуацыі? На пошукі «вандроўніка» адправіўся разам з тым мужыком Алег Антонавіч. Калі стары знайшоўся, новая бяда ў той сямейнай пары выявілася: у мужыка ключоў ад машыны няма. Згубіліся недзе, выпалі разам з кашальком, у якім былі і ключы ад кватэры.

Во праблема, дык праблема! Што рабіць? Кашалёк, вядома, не іголка ў стозе сена. Але ж і лес — не стог сена. Паспрабуй знайсці. Невядома, чым бы ўсё скончылася, калі б Яўгенія Максімаўна не даўмелася спытаць ва ўладальніка «мерседэса», а ці не поўзаў ён на карачках за маслякамі ў тым сасняку. Поўзаў: быў адказ. Усе чацвёра накіраваліся туды, і — во радасць! — кашалёк знайшоўся.

Удзячны мужчына спрабаваў даць Астапчукам за выручку дваццаць еўра (больш грошай на той момант у яго, казаў, не было), але тыя далікатна і катэгарычна адмовіліся. Калі ж яны на нейкі момант па пільнай патрэбе адлучыліся ад сваёй легкавушкі, то, вярнуўшыся, выявілі каля яе тую цэлафанавую плёнку з цэлай грудай грыбоў. З адпаведнай запіскай незнаёмцаў, якія ўжо ад'ехалі.

...Не буду сцвярджаць, што Астапчукі пасля такіх лясных прыгод сталі заядлымі аматарамі «ціхага палявання», але дакладна ведаю, што пэўную цікавасць да яго яны пачалі праяўляць. І што скласці ў гэтым пытанні канкурэнцыю сужэнцам Хутарным яны яшчэ наўрад ці змогуць.

ЖАВАРАНАК

Нядаўна быў на сваёй «фазэндзе». Стаяла цудоўнае надвор'е: ярка свяціла сонейка, цяплынь разлеглася паўсюдна. Так ужо і атрымалася, што там, на лецішчы, памяць вярнула мяне ў шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя, калі я працаваў настаўнікам адной са школ Сельмашаўскага мікрараёна горада Гомеля. Аднойчы ў завадскім Палацы культуры давялося прысутнічаць на канцэрце мастацкай самадзейнасці. Калі канферансье аб'явіў, што чарговым нумарам будзе «Жаваранак» Міхаіла Глінкі, я не разабраў прозвішча выканаўцы. Затое добра разгледзеў яго. Сярэдняга росту, прыгожа апрануты, асцярожныя крокі па сцэне.

Усе сціхлі, калі пачуліся першыя меладычныя гукі. Танюсенькія, цюхенькія, нясмелыя, яны станавіліся ўсё званчэй і званчэй і раптам хлынулі ў залу, запоўніўшы яе пявучай паводкай. Гэтак жа нечакана яны абарваліся на самай высокай ноце. І ў тое ж імгненне зала ўзарвалася апладысментамі. Музыка нізка пакланіўся, і калі вядучы праграмы аб'явіў, што перад намі выступаў невідушчы работнік Гомельскага вучэбна-вытворчага прадпрыемства сляпых Адам Данчанка, гледачы запляскалі яшчэ дружней.

Сваім сённяшнім аповедам я хачу на канкрэтным прыкладзе яшчэ раз паказаць, што калі чалавек, паставіўшы перад сабой высокую мэту і цярпліва, мэтанакіравана, сціснуўшы зубы, ідзе наперад і толькі наперад, можа пераадолець усе цяжкасці, якія паўстаюць на яго жыццёвым шляху.

...Вечны змрок ахутаў вочы хлапчука Адама Данчанкі з вёскі Дуброўна Брагінскага раёна на першым годзе жыцця. Калі ён пачаў падрастаць і ўжо асэнсоўваў, у якім апынуўся становішчы, неадчэпныя, трывожныя і адчайныя думкі ўсё роўна не пакідалі яго: няўжо слепата на ўсё жыццё авалодала яго істотай? Так, сцвярджалі ўрачы, змяніць нічога нельга.

Адам разумеў іх добра: вярнуць натуральны зрок яму не ўдасца ніколі. Але ці можна, калі праявіць волю, настойлівасць, напоўніцу выкарыстаць прыродную кемлівасць, розум, у рэшце рэшт, адчуваць сябе відушчым?

— Хочаце верце, а хочаце — не, — апавядаў мне Адам Васілевіч, — нешта кранулася ў маёй душы, калі ў пяцігадовым узросце пачуў на полі нейкую птушыную песеньку, якая так усхвалявала мяне сваімі чароўнымі званочкамі, што я спытаў у бацькі, чыя яна? Жаваранка, быў адказ. Бацька захапляўся музыкай і на сваім гармоніку нярэдка іграў «Жаваранка» рускага кампазітара Глінкі. Вось тады мне неадольна захацелася навучыцца авалодаць той мелодыяй.

Каб здзейсніць гэта, спатрэбіўся не адзін дзясятак гадоў. Дапытлівы юнак прагнуў ведаў, шукаў дарогу, каб разарваць вечную заслону змроку, наканаваную яму лёсам. Ён паступіў спачатку ў Магілёўскую, а затым Ленінградскую завочную школу для сляпых, стаў працаваць настаўнікам спеваў у Астраглядаўскай сярэдняй школе, куды са сваёй вёскі хадзіў за тры кіламетры без усякага павадыра і ніводнага разу не заблукаў.

Потым лёс звязаў яго з Гомелем, дзе ён пачаў працаваць на вышэйназваным прадпрыемстве, дзе стварыў сям'ю, атрымаў кватэру і дзе... вырашыў паступіць у мясцовае музычнае вучылішча імя Н. Ф. Сакалоўскага. Калі будзе атэстат за восем класаў, сказалі там, тады і прыходзь. І ён прыйшоў, адолеўшы школу рабочай моладзі ў сорак пяць гадоў. Вучыўся ж паралельна са сваімі двума сынамі (тыя, вядома ж, у сярэдняй школе). За той час Адам Васілевіч уважліва перачытаў кнігі Мікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь», Барыса Палявога «Аповесць аб сапраўдным чалавеку», Уладзіміра Караленкі «Сляпы музыкант» і іншыя, у якіх чэрпаў сілу. Калі ж стаў завочнікам, падручнікі з рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля атрымліваў з Масквы. У многім дзякуючы чаму авалодаў акардэонам, баянам і кларнетам.

І яшчэ. На прадпрыемстве мне расказалі пра тое, што Адам Данчанка з'яўляўся адзіным сляпым, які паспяхова спраўляўся з вельмі складаным аперацыяй па зборцы паніжаных трансфарматараў для лямпаў дзённага святла. А таксама пра тое, што ў Палацы культуры «Гомсельмаша» ён упершыню сыграў на баяне «Жаваранка», які не даваўся яму цэлымі гадамі.

Так вось залатыя рукі, настойлівы характар і пытлівы розум Адама Васілевіча Данчанкі, якога ўжо няма на гэтым свеце, зрабілі яго відушчым.

ТЫДЗЕНЬ ЖАХАЎ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Марыя Майсееўна і Віктар Іванавіч Філатавы пусцілі на свет шасцярых дзяцей, якія ўжо даўно разляцеліся хто куды (у Мінск, Рэчыцу і нават у Паўночную Амерыку) і займелі свае сем'і. І толькі адна, самая малодшая дачка Таццяна, інвалід з дзяцінства, пражывае разам з бацькамі ў вёсцы Віша Светлагорскага раёна.

Іншым разам радня збіраецца дружным гуртам, і тады хто-ніхто з дзевятнаццаці ўнукаў і праўнукаў, ведаючы ад сваіх бацькоў, што бабуля Марыя пацярпела ад фашыстаў, не-не ды і спытае, як яна выжыла тады, як вытрымала. Адказ заўсёды гучыць прыблізна так:

— Ды сама, дзеткі мае, не ведаю. То былі не людзі, а звяругі шалёныя. Яны ўсіх нас хацелі зрабіць рабамі ці пазбавіць жыцця.

У такія вось хвіліны, калі перад вачыма старой як бы праплывалі тыя страшэнныя саракавыя гады, яна змахвала з твару нясціраную слязу і пачынала свой расказ.

— Што добра памятаю сама, што ведаю ад мамы Таццяны Мікалаеўны, але гавару чыстую праўду. Калі немцы захапілі нашу вёску, амаль усё насельніцтва яе заставалася на месцы, акрамя тых, хто пайшоў у партызаны ці яшчэ раней быў прызваны ў Чырвоную Армію. У ліку апошніх быў і мой бацька Майсей Сцяпанавіч Вішнеўскі, які з фронту так і не вярнуўся. А ў маці на руках нас засталося трое: Іван, Коля і я, пяцігадовая.

З самага пачатку акупацыі заваёўнікі засведчылі сябе сапраўднымі неўтаймаванымі і прагнымі разбойнікамі. Пад гукі губных гармонікаў яны весела прагульваліся па вёсцы, заходзілі ў хаты і на падворкі і адбіралі ў людзей усё, што ім падабалася. Многіх яны выганялі з нажытых хат у хлявы і падвалы, а самі засялялися туды. Маці вырашыла, што сям'і спакайней будзе ў суседніх Сямёнавічах, дзе жылі яе бацькі. Але яна памылілася.

У Сямёнавічах у адну з хат немцы загналі многа старых, жанчын і дзяцей і падпалілі яе. Шанцаў выжыць у агні не было. Там загінулі свёкар, свякруха Марыі цёткі і двое яе дзяцей. А сям'я Вішнеўскіх разам з такімі ж няшчаснымі людзьмі апынулася ў Азарыцкім канцлагеры смерці. Марыя Майсееўна, раз-пораз прыкладваючы хусцінку да вачэй, успамінае, якія жахі там тварыліся.

— Мне было тады сем, Колю — восем, а Ваню — крыху больш дванаццаці гадоў. Па дарозе туды, памятаю, немцы раз-пораз стралялі па тых, хто адставаў. Я ад страху ўплялася ў руку мамы, а Коля — у руку Вані. Глядзім, на вялікай плошчы дробналесся высокая, калючая, з дроту, агароджа, а на вуглах нейкія вышкі. Як выявілася пасля, яны былі вартавыя і абсталяваныя кулямётамі. Неаднаразова бачыла і чула, як з іх абрушваўся агонь, калі хто з няшчасных набліжаўся да той агароджы.

Мясцовасць была цалкам адкрытай, і на ёй — ніводнага збудавання, дзе б можна было прытуліцца. Калі хто спрабаваў раскласці вогнішча, яго расстрэльвалі. Нідзе не было прыбяльняў. Сотні, а можа і тысячы змарнаваных голадам і холадам старых, жанчын і дзяцей ледзь цягалі ногі. Спалі проста на зямлі, і пасля кожнай ночы на ёй заставалася шмат трупаў, якія ніхто не прыбіраў. Вады не давалі, і людзі здабывалі яе з балацянак, якія былі тут жа на тэрыторыі лагера. Ці трэба здзіўляцца, што ў такой абстаноўцы ўсе павальна хварэлі, што тут панаваў сыпны тыф. Марыя тады моцна прастудзілася, але дзякуючы маці паправілася. Калі немцы кідалі цераз агароджу хлеб, людзі падхоплівалі яго, учыняючы бойкі. І тады па іх стралялі.

— Нам пашанцавала застацца ў жывых толькі таму, што ў канцлагеры сям'я прабыла параўнальна нядоўга, — працягвала свой расказ Марыя Майсееўна. — Мы плакалі ад радасці, калі (а было гэта, здаецца, у сакавіку 1944 года) чырвонаармейцы разам з партызанамі вызвалілі нас. Яны размініравалі дарогу, па якой выводзілі вязняў з няволі і папярэджвалі, каб яны не збочвалі з яе ні на крок. На нашых вачах некалькі чалавек, у тым ліку і цяжарная жанчына, якая ішла побач з маёй цёткай Пашай, падарваліся на мінах.

Вяртанне дадому было радасным і абнадзейваючым, тым больш што хата Вішнеўскіх уцалела. Маці Таццяна Мікалаеўна пайшла працаваць у калгас даяркай, брат Іван уладкаваўся трактарыстам у Разанскай вобласці, куды пасля паехала Марыя і адкуль прывезла ў Беларусь мужа Віктара Іванавіча. Калі ж маці пайшла на пенсію, замяніла яе на ферме, аддаўшы працы 30 гадоў. А Колю не пашанцавала. Калі гулялі з кампаніяй равеснікаў «у вайну», ад выбуху гранаты яму знявечыла пальцы і вельмі пашкодзіла вочы. Таму і апынуўся ў Мазыры ў таварыстве сляпых, дзе праз некалькі гадоў памёр.

Фота Сяргея КЕБІКАВА.

Былы вязень Азарыцкага канцлагера Марыя Майсееўна Філатава ў Гомельскім абласным шпіталі ветэранаў вайны.

Толькі пасля вайны бабуля Марыя даведалася, што вязнямі Азарыцкага канцлагера былі каля пяцідзесяці тысяч савецкіх грамадзян, і што на волю выйшла толькі 33 тысячы чалавек. Многія памерлі пасля ад ран і хвароб, многія сталі інвалідамі. Сярод іх і Марыя Майсееўна, якая перанесла тры хірургічныя аперацыі і пастаянна пралечваецца ў Гомельскім абласным шпіталі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны.

— Дзеткі мае даражэнькія, — звычайна заканчвае свой расказ Марыя Майсееўна, — не дай божа, каб зноў была вайна. Жывіце ў радасці, у спакоі і беражыце мір.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ООО «Санта Ритейл»
Бухгалтерский баланс на 30.06.2019 года
Отчет за январь – июнь 2019 года

(в тысячах белорусских рублей)

Активы	Код строки	На 30.06.2019	На 31.12.2018
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	89036	80669
Нематериальные активы	120	1905	1930
Вложения в долгосрочные активы	140	18095	10079
Долгосрочные финансовые вложения	150	54574	65078
Прочие долгосрочные активы	180	381	355
ИТОГО по разделу I	**190**	**163991**	**158111**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	19351	20667
в том числе: материалы	211	1738	1089
готовая продукция и товары	214	17613	19578
Расходы будущих периодов	230	101	9
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	1485	2185
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	11693	5390
Краткосрочные финансовые вложения	260	36084	27904
Денежные средства и их эквиваленты	270	5030	7617
ИТОГО по разделу II	**290**	**73744**	**63772**
БАЛАНС	**300**	**237735**	**221883**
Собственный капитал и обязательства	Код строки	на 30.06.2019	на 31.12.2018
1	2	3	4
Уставный капитал	410	54288	54288
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	3545	3570
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	10028	10011
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	3733	
ИТОГО по разделу III	**490**	**71609**	**67884**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	129497	109099
Отложенные налоговые обязательства	530		95
Доходы будущих периодов	540		
ИТОГО по разделу IV	**590**	**129497**	**109194**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	36629	44803
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	32941	40197
по авансам полученным	632	6	7
по налогам и сборам	633	548	196
по социальному страхованию и обеспечению	634	334	315
по оплате труда	635	1418	1226
по лизинговым платежам	636	1012	2616
прочим кредиторам	638	370	246
Доходы будущих периодов	650		2
ИТОГО по разделу V	**690**	**36629**	**44805**
БАЛАНС	**700**	**237735**	**221883**

Отчет о прибылях и убытках
за январь – июнь 2019 года

(в тысячах белорусских рублей)

Наименование показателей	Код строки	За январь-июнь 2019	За январь-июнь 2018
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	172207	131931
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(139557)	(108415)
Валовая прибыль (010-020)	030	32650	23516
Управленческие расходы	040	(3711)	(2132)
Расходы на реализацию	050	(32683)	(22375)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	(3744)	(991)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	7808	4885
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(1461)	(601)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	2603	3293
Доходы по инвестиционной деятельности	100	2446	3453
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	6	3165
проценты к получению	103	2437	286
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	3	2
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(126)	(4142)
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(126)	(4141)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		(1)
Доходы по финансовой деятельности	120	5277	605
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	5277	605
Расходы по финансовой деятельности	130	(6231)	(617)
в том числе: проценты к уплате	131	(3704)	(338)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(2363)	(277)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(164)	(2)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	1366	(701)
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	3969	2592
Налог на прибыль	160	(330)	(365)
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	95	18
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(1)	(1)
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	3733	2244
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	3733	2244

УНП 291313486

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 14 августа 2019 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 35 % после очередных несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости (лот № 1), принадлежащих открытому акционерному обществу «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко» на праве собственности

Состав лота № 1

Корпус опытно-промышленного производства сорбентов, инв. № 350/С-107542. Назначение: здание неустановленного назначения. Трехэтажное кирпичное здание, год постройки – 1993. Общая площадь 2311,3 кв. м. Составные части и принадлежности: крыльца

Автостоянка № 2, инв. № 350/С-107541. Назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. Открытая площадка, год постройки – 2003. Площадь 1812 кв. м. Составные части и принадлежности: площадка, ворота, ворота. **Часть сооружения – 520,0 кв. м сдана в аренду сроком по 31.07.2023 г.**

Зарядная станция, инв. №350/С-56078. Назначение: здание специализированное иного назначения. Одноэтажное кирпичное здание, год постройки не определен. Общая площадь 172,0 кв. м. **Часть здания – 118,0 кв. м, сдана в аренду сроком по 31.07.2023 г.**

Местонахождение объектов: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150

Земельный участок для обслуживания объектов недвижимости на праве постоянного пользования площадью 0,4858 га с кадастровым номером 340100000005005823. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Помещение транспортного назначения, инв. № 350/D-182492. Назначение: помещение транспортного назначения. Нежилое изолированное помещение расположено в пристройках к двухэтажному кирпичному зданию 1950 года постройки. Общая площадь 294,9 кв. м. **Часть помещения – 134,0 кв. м, сдана в аренду сроком по 31.07.2023 г.**

Местонахождение объекта: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150-1

Земельный участок для обслуживания здания, в котором расположено изолированное помещение, на праве постоянного пользования площадью 8,4705 га с кадастровым номером 340100000005001181. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена лота № 1 – 374 585,99 рубля (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток по лоту № 1 – 37 458,59 рубля** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 13 августа 2019 г.** включительно. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 14 августа 2019 г. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно представляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 31 июля 2019 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 2 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 60 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов.

Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 26.02.2019 г. № 38, от 11.04.2019 г. № 68, от 04.05.2019 г. № 83, от 23.05.2019 г. № 94, от 11.06.2019 г. № 107, от 29.06.2019 г. № 121, от 17.07.2019 г. № 132

Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.
Тел.: +375 (232) 32-46-47; 32-18-95, сайт: gino.by, e-mail: auction-gino@gino.by.

Продавец: ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко», г. Гомель, ул. Барыкина, 150. Тел.: +375 (29) 318-68-11, +375 (232) 23-84-02

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «СМТ № 41» г. Сморгонь, Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Гагарина, д. 24

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Инвентарный номер	Общая площадь	Адрес
Навес арматурный	Здание нежилое	443/С-14639	1123,2 кв. м	Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 34

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания навеса арматурного, пл. **0,1401** га

Начальная цена с НДС 20 % – 87 000,00 бел. руб. (снижена на 50 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи — **5** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 29.06.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 14.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 12.08.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42, www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона

Административное здание банка (здание административно-хозяйственное), общ. пл. **944,4 кв. м**, инв. № **640/С-27649**, по адресу: **Минская обл., г. Слуцк, ул. Строителей, д. 5А.**
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,1632 га для обслуживания зданий и сооружений

Начальная цена с НДС 20 % – 584 298,24 бел. руб.

Дополнительные условия: победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договора купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона на сумму 33 917,98 бел. руб. с НДС 20 %. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов www.cpo.by

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Дата и время проведения аукциона	**03.09.2019 г.** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**31.08.2019 г.** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Контактные телефоны:	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Извещает о внесении изменений в извещение о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Торгмаш», назначенного на 08.08.2019, следующего содержания:

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	637 867,99	**Размер задатка, руб.**	31 893,40

Условия продажи:
1) При заключении договора Покупатель возмещает затраты по оценке в размере 3715,95 рубля (три тысячи семьсот пятнадцать рублей 95 копеек), а также затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, включая вознаграждение Организатора аукциона.
2) Земельный участок с кадастровым номером 141000000001002734 подлежит ограждению Покупателем.
Обременения: наличие договора аренды.

Телефоны для справок 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Торгмаш» опубликовано в газете «Звязда» от 27.07.2019.

УНП 201028245

Фестывалім!

ГУЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ВУЛІЦ

У Гродне прайшоў VIII Міжнародны Біг-міні-фестываль вулічнага мастацтва

На пешаходнай вуліцы абласнога цэнтра гучалі паўночныя напевы, афрыканскія матывы, лацінаамерыканскія рытмы. Тут можна было пачуць аўстралійскі дыджэрыду, шаманскі бубен, бразільскі барабан. Чарговае вулічнае свята сабрала больш за паўсотні калектываў і асобных удзельнікаў.

А пачалося ўсё ў 2012-м. Напачатку гэта была ініцыятыва саміх музыкантаў, але ўжо ў наступным годзе вулічнае мастацтва падтрымалі гарадскія ўлады. Фестываль стаў новай «фішкай» турыстычнага горада. Да свята далучыўся гарадскі цэнтр культуры.

Арганізатар Анастасія РОЎБА ўспамінае:

— Нават не марылі, што першая спроба перарасце ў такое маштабнае мерапрыемства. Проста вырашылі выступіць са сваёй праграмай фаер-шоу і запрасілі з аналагічным праектам калег з іншых гарадоў. Праўда, надвор'е ў той вясновы дзень выдалася халоднае, але гледачы сабраліся і цёпла сустрэлі выступленне фаершчыкаў. Дарэчы, і сёлета ажно 13 аматараў вогненнага шоу выступілі з даволі працяглай праграмай, якая доўжылася паўтары гадзіны.

Тры першыя фестывалі праходзілі камерна, на адной пляцоўцы, чацвёрты ўжо выйшаў на вуліцы. І з тае пары ён прырастае ўдзельнікамі. Увогуле, фестываль стаў міжнародным, сюды прыехала нават фаершчыца з Італіі. Таксама сваё мастацтва прадставілі калектывы Польшчы, Расіі і Украіны.

Што ляжыць у аснове вулічнага мастацтва? Асабіста мне здалося, што гэта барабанны грукат, вясёлае шэсце, жывыя статуі і абавязкова музыканты...

— Безумоўна, усё так і адбываецца на фестывалі. Але не гэта галоўнае, — заўважае Анастасія. — Галоўнае — свабода выказвання сваіх эмоцый, талентаў. Тут няма вызначаных канонаў, як, напрыклад, у балеце ці цырку. На вуліцы працуюць, што называецца, «свабодныя мастакі». Гэта людзі, у якіх часцей за ўсё няма спецыяльнай адукацыі; аматарскія калектывы, у якіх аб'яднаны і праграмісты, і прадаўцы, і ўрачы. Яны даносяць традыцыі розных культур, атрымоўваецца змястоўна і весела.

Больш за ўсё падаецца музычных заявак. Так было і гэтым разам. Каб ахапіць усіх удзельнікаў, якія імкнуліся прадэманстраваць свае таленты, было створана пяць пляцовак. На адной з іх гледачы захапіліся ўсходнімі танцамі.

Было цікава ўсім — і дзецям, і дарослым. Так, юных наведвальнікаў заклікала творчая майстэрня па вырабе арыгамі, дарослыя маглі паразважаць над перфомансам «Звязкі», у якім артысты, звязаныя доўгімі вяроўкамі, паказвалі сувязь людзей паміж сабой.

Дарэчы, ніякага ганарара вулічныя артысты не атрымліваюць. Але яны не кінуты на волю лёсу. Ім аплачваюцца пражыванне, харчаванне, таксама праезд. Фестываль падтрымлівае буйны нафтавы канцэрн — ён дае сыравіну для фаер-шоу. Кампанія — аператар тэлефоннай сувязі забяспечвае прывоз артыстаў з-за мяжы. Каб было больш якасна, трэба шукаць дадатковыя сродкі.

З дывідэндаў вулічныя артысты маюць толькі тое, што заробяць на вуліцы, пусціўшы, як кажуць, шапку. Так было здаўна. Цяпер усё больш папулярныя жывыя статуі. Падчас фестывалю іх можна было сустрэць уздоўж пешай вуліцы. Былі тут і Квазімода, і персанажы з вядомага кінафільма «Жорсткі раманс». Забаўлялі гараджан Мэры Попінс, тата Карла, чарапаха Тарціла. Жывыя статуі прадстаўлялі некалькі расійскіх тэатраў, у тым ліку з Санкт-Пецярбурга і Тальяці. Многія рабілі сэлфі і здымкі з ажылымі постацямі.

У гэты дзень публіка напоўніла пешаходную вуліцу, што называецца, пад завязку. Многія гродзенцы на фестывалі не першы раз. Сярод іх Ірына, якая выйшла з сяброўкай на шпацыр. Яна ўспамінае, як скептычна раней ставіліся да вулічных артыстаў, у прыватнасці музыкантаў. Але цяпер адносіны мяняюцца.

— Радуе, што гараджане ставяцца станоўча да іх творчасці, падтрымліваюць, не лічаць іх нейкімі папрашайкамі, як раней. Такія вулічныя фестывалі якраз і дапамагаюць зрабіць нормай выступленні на вуліцах. Калі ідзеш на шпацыр, музычнае суправаджэнне не перашкаджае, а, наадварот, уздымае настрой. Дарэчы, на пешай вуліцы ў Гродне музыканты ёсць пастаянна. Асабліва прыемна пачуць гукі акардэона, лёгкі шансон надае шарму гарадскому асяроддзю, — лічыць Ірына.

А вось сам фестываль грукатаў бразільскімі барабанамі. Набліжэнне калоны фестывальнага шэсця было чуваць далёка па наваколлі. Калектыў з Мінска Raccoon Batucada задаваў вясёлы тон бразільскай самбай. Як расказала адна з удзельніц Таццяна Навіцкая, калектыў з'явіўся дзякуючы дапамозе пасольства Бразіліі ў Беларусі — менавіта адтуль паступіла некалькі барабанаў. Дарэчы, у жніўні ў сталіцы пройдзе традыцыйны фестываль бразільскай культуры, у якім возьмуць удзел аматары самбы з усёй краіны.

Зарабіць на вулічным мастацтве ўдаецца няшмат, таму кожны ўдзельнік калектыва мае іншую спецыяльнасць. Але ўсе яны любяць збірацца разам. Па словах Таццяны, гэта мастацтва аб'ядноўвае людзей, стварае сяброўскую атмасферу. У многіх краінах такія святы-фестывалі ўжо даўно папулярныя і збіраюць шмат прыхільнікаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота аўтара і БелТА.

...І ЗІМОВАЕ РЭХА «БАЗАРУ»

У дырэкцыі самага маштабнага на постсавецкай прасторы Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» падвялі вынікі.

Кіраўнік дырэкцыі Глеб Лапіцкі расказаў, у прыватнасці, што сёлета прыблізна на 10 % больш рэалізавалі білетаў — каля 72 тысяч. Акрэдытацыю атрымала каля 5270 чалавек. Усяго адбылося больш за 160 мерапрыемстваў. А дзякуючы магчымасці прыехаць на фэст у рамках бязвізавага рэжыму Віцебск наведалі прыблізна восем тысяч турыстаў. Вельмі добра разыходзіліся білеты на латвійскай анлайн-платформе продажу — каля 1270 (для параўнання: летась іх рэалізавалі прыблізна 50). У дырэкцыі «Базару» паведамілі, што цяпер будуць рэкламаваць аналагічную магчымасць у Літве і Эстоніі.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Глеб Лапіцкі падзякаваў валанцёрам, якія ўпершыню працавалі на «Базары». Усяго іх было каля 190, а самая старэйшая нарадзілася ў 1940 годзе! На наступным фестывалі, магчыма, будуць задзейнічаны не толькі віцебскія валанцёры, але і памочнікі з іншых гарадоў і нават краін. (Сёлета, дарэчы, у фэсце бралі ўдзел прадстаўнікі 42 дзяржаў.) Вельмі шмат людзей сачыла за падзеямі фэсту ў інтэрнэце. Напрыклад, сайт «Базару» ў дні яго правядзення наведала 223 тысячы чалавек, а колькасць праглядаў перавысіла 600 тысяч.

Глеб Лапіцкі анансаваў новы праект, які цэнтр культуры «Віцебск» правядзе зімой адразу пасля Каляд. Пра тое, якім ён будзе, інфармацыя пакуль не распаўсюджваецца. Можна, напэўна, дакладна назваць яго «зімовым рэхам фестывалю».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Запрашальнік

КЛОЎНЫ, ЯКІЯ ВУЧАЦЬ ДАБРУ

Найлепшыя цыркачы свету збяруцца ў беларускай сталіцы

З 19 да 22 верасня ў Беларускім дзяржаўным цырку пройдзе Другі Мінскі міжнародны фестываль цыркавога мастацтва. Мінчане і госці сталіцы займеюць унікальную магчымасць пазнаёміцца з найлепшымі дасягненнямі сусветнай цыркавой справы і трапіць на сапраўднае свята прыгажосці, грацыі і трука.

Для ўдзелу ў цыркавым шоу даслалі заяўкі больш за 300 артыстаў з розных краін. Па выніках скрупулёзнага адбору ў фестывалі возьме ўдзел каля 100 майстроў цырка з Бразіліі, Чылі, Кітая, Аўстраліі, Эфіопіі, Таджыкістана, Ізраіля, КНДР, Румыніі, Туркменістана, Украіны, Малдовы, Германіі, Казахстана, Расіі, Беларусі. Арганізатары абяцаюць, што на фестывалі будзе цікава як аматарам, так і знаўцам цырка. Удзельнікі пазмагаюцца за ўзнагароды ў намінацыях «Гран-пры», «Залата», «Серабро», «Бронза», «Прыз глядацкіх сімпатый», «Прыз дзіцячага журы» і за іншыя спецыяльныя прызы.

Дырэктар Белдзяржцырка Уладзімір ШАБАН расказаў, што некаторыя краіны будуць прадстаўлены 2-3 нумарамі. З Расіі выступяць артысты з Расдзяржцырка, Вялікага Маскоўскага дзяржаўнага цырка і Маскоўскага цырка Нікуліна на Каляровым бульвары — ва ўсіх гасцей вельмі высокі выканальніцкі ўзровень. Расіяне прадставяць «Сустрэчныя арэлі», на якіх будуць працаваць дзяўчыны ў яскравых бальных сукенках — па ўсім можна меркаваць, атрымаецца чароўнае відовішча. Выступіць Сяргей Несцераў з дрэсіраванымі белымі тыграмі, які пакажа ўнікальную работу дрэсіроўшчыка з жывёламі — без бізуноў і штыкоў. Ізраіль прадставіць два нумары, адзін з якіх выканае 18-гадовая паветраная гімнастка Аліса Шэхтар з ашдоцкага цырка «Дорату», а падчас другога нас чакае фантастычная трансфармацыя — імгненныя пераадзяванні Даніэля Беньяміна.

Клоўны Антон і Віктар ФРАНКЕ, прадстаўнікі цыркавой дынастыі.

Словам, на фестывалі будзе сабрана разнастайная жанравая палітра цыркавога мастацтва: акрабатыка, гімнастыка, жангліраванне, клаўнада, эквілібрыстыка, фокусы, дрэсура і атлетыка. Беларусы таксама рыхтуюць некалькі нумароў. Паветраную гімнастыку прадставіць дуэт Анастасіі Данчанкі і Анастасіі Пуцяты, у атракцыёне Барыса Лазарова будуць задзейнічаны дрэсіраваныя вярблюды і ламы. Асілкі браты Дзмітрый і Багдан Казаковы, верагодна, падрыхтуюць новы ўнікальны трук.

